

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Беларускае слова ў эфіры
а. РЫГОР МІСІЮК ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 11 (2496) Год XLIX | Беласток, 14 сакавіка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Я сам не мог бы маляваць у час, калі бацькі цяжка працуюць... Справа ў пашане да іх жыцця... Я ўдзячны, што не шкадавалі мне грошай на навуку і зараз магу рабіць тое, чым займаюся.

Важны дух!

З Юркам ФЕДАРУКОМ, мастаком родам з Рыбалаў, гутарыць Ганна Кандрацюк.

— Сустракаемся ў новай беластоцкай кавярні „Кабарэ", вытрыманай у клімаце парыжскага імпрэсіянізму. Ты аўтар яе інтэр'ера. Віншую! Ці гэта твой першы такі публічны праект?

— Першы.

— Наша гутарка будзе, аднак, пра жывапіс. Ад 9 сакавіка г.г. у беластоцкай галерэі кінатэатра „Форум" можна глядзець твой вернісаж „Карціна". Гэта твая другая персанальная выстаўка; у кастрычніку 2002 года ты паказаў карціны „Квадрат метафізічны і іншыя аповеды". А зараз...

— Мелі быць „Карціны", але па прычыне памылкі ў друку — атрымалася „Карціна".

— Колькі, дарэчы, паказваеш твораў?

— Трынаццаць-чатырнаццаць новых і тры старыя.

— Ці ёсць тут асноўная КАРЦІНА?

— Гэта „М. і Каралеўства крэсел". Тут сам загаловак ужо многае тлумачыць.

— Скажы больш.

— Кожны хай прачытае яе на свой спосаб. Ад сябе магу сказаць, што „М. і Каралеўства крэсел" гэта свайго роду паклон людзям з асяроддзя літаратурна-мастацкага часопіса „Карткі", з якімі спалучае мяне эмацыянальная і духоўная сувязь. З імі я падобна гляджу на свет.

— Што, у параўнанні з першай выстаўкай, тут новае?

— На першай я паказаў амаль усе свае карціны і не ўсе яны да сябе падыходзілі. А тут яны вытрыманы ў адным духу. Хачу адзначыць, што „Карціна" завяршае пэўны этап. Ужо ў мяне няма патрэбы так маляваць і не хачу ўжо рабіць выстаўкі з карцінамі ў рамах.

— І што далей?..

— У лістападзе планую чарговы вернісаж. Думаю пра інсталяцыю.

— Ты ж — вораг інсталяцый?

— Гэта праўда. Але ў маёй інсталяцыі найважнейшае месца зойме жывапіс. Напэўна не пастаўлю там нужніка ці чагосьці такога!

— Сваёй дарогай — было б вялікае ажыўленне і многа шуму вакол тваёй асобы. А што ты прыдумаў?

— Рабочая назва гэта „Дзяды — інсталяцыя з карцінамі ў фоне". Магу толькі сказаць, што будзе там арка. Сама ідэя Дзядоў і памерлых здаўна мяне праследуе. Можа будзе прысвечана тым людзям. Бо мы ў сённяшнім свеце — гаўно. Людзі жывуць „тут і цяпер" і важна, як чалавек жыве, ці мае грошы, як ён апрануты. А так не павінна быць! Важны — дух.

— Ці далей твой любімы жывапісец — Ежы Навасельскі?

— Навасельскі мне падабаецца, у тэхнічным плане падабаецца мне Бальчыюс.

— Ад каго наследуеш талент?

— Цяжка сказаць. Мой бацька добра рысаваў. З сям'і мамы рысаваў і маляваў яе брат Мікалай Бручко. Калі сёння гляджу на тыя малюнкі, бачу, што ў іх штосьці было.



Юрка Федарук і яго карціна „М. і Каралеўства крэсел"

Мама і бабулі, як усё кабеты на вёсцы, ткалі ходнікі і дываны, вышывалі.

— Ці маеш малюнкі з дзяцінства?

— Маю.

— Каго тады ты рысаваў?

— Маму. І, як усе хлопцы ў той час, баталістычныя сцэны.

— Ці бацькі хацелі, каб ты стаў жывапісцам?

— На вёсцы жывапісец гэта не прафесія. Тут у пашане доктар, інжынер, юрыст — гэта ў нас кар'ера.

— Аднак у пачатковай школе ты ўжо ездзіў на мастацкія пленэры.

— Там падабалася мне атмасфера, бо супольнага малявання не люблю. Саромеюся маляваць пры іншых. У мяне гэта справа вельмі прыватная. А там нехта ўсё падыходзіць, паказвае. Калі я пачынаю маляваць, звычайна не паказваю, пакуль не закончу.

— Ты вучыўся ў Мінску на факультэце прыкладнога мастацтва.

— Але галоўны націск там кладзецца на маляванне і рысаванне, на асвойванне тэхнікі.

— У цябе модная і прэстыжная ў рынкавым сэнсе прафесія — інтэр'ершчык. Схіляешся, аднак, у бок жывапісу, апрача карцін ты выканаў графікі для кніжак Юркі Гуменюка, Ірэны Стэльмах, вокладку для часопіса „Карткі"... Дзе ты найлепш сябе адчуваеш: у інтэр'еры, графіцы, жывапісе?

— У жывапісе.

— А ці мог бы ты аддаць сябе толькі маляванню?

— Не ведаю, — я з вёскі. Часам лаўлю сябе на тым, што падсвядома думаю як людзі ў вёсцы: „Што там маляваць — робота то накідаць гною, сена павазіць".

Людзі пытаюць, ці не перашкаджае мне праектаванне інтэр'ераў. Мабыць, перашкаджае. Хоць, з другога боку — трэба штосьці рабіць. Трэба чымсьці заняцца, няма гатовага рэцэпта на тое, каб нарадзілася карціна. Часам такое бывае на будове. Раптам перавернецца ў галаве і нешта пабачыш. Тады хуценька раблю эскіз. У гэты момат ёсць праблема часу, ці знойдзецца час і сіла спалучыць працу і маляванне.

— Ад першай сустрэчы размаўляем па-беларуску.

— У мяне не было праблем са свядомасцю. Бацькі заўсёды былі беларусамі. У мяне таксама ніколі не будзе сумненняў, хто я. Ці я рускі, паляк, ці ўкраінец? Я нарадзіўся беларусам і гэта факт. Мяне так выхавалі бацькі. У маёй хаце заўсёды чыталі „Ніву". У дзяцінстве бацька чытаў мне і сястры „Зорку".

Мяне нават здзіўляе, калі ў такім Беластоку нехта не верыць у нармальнасць, што ты беларус — і ўсё!

— Любіш Рыбалы?

— Там я — у сябе. Але жыць там і займацца жывапісам — складана. Часам, калі ў хаце размаўляем пра маё маляванне, бацька кажа: „Кідай тое маляванне і бярыся за работу".

Я сам не мог бы маляваць у час, калі бацькі цяжка працуюць, напрыклад, едуць сушыць сена, а я застаюся дома маляваць карціны. Справа ў пашане да іх жыцця. Я ўдзячны, што не шкадавалі мне грошай на навуку і зараз магу рабіць тое, чым займаюся.

— Ці дарагія твае краціны?

Замест адказу чуецца гучны, характэрны Юрку, смех.

Гутарыла Ганна Кандрацюк

Юрка Федарук — нар. у 1972 г. у Рыбалах; вучыўся ў бельскім беларускім ліцэі; закончыў Акадэмію мастацтваў у Мінску на аддзяленні прыкладнога мастацтва і інтэр'ера; жыве і працуе ў Беластоку.

Дружба атручаная газам ☞ 2

Віталь Луба

Рэзкія выказванні прэзідэнта Лукашэнкі па тэлебачанні ў адрас Расіі, непрыхільныя ёй ацэнкі ў дзяржаўным друку могуць пахіснуць веру ў дружалюбнасць суседняй брацкай дзяржавы нават у зацятых прыхільнікаў інтэграцыі...

Краіна малочных рэкаў ☞ 2

Яўген Міранові ч

У Баранавічах лепей адчуваецца дух тае Беларусі, якая адлюстроўваецца ў літаратурных творах найбольш вядомых пісьменнікаў і карцінах мастакоў. Здаецца, нідзе ў краіне на слова сказанае па-беларуску не адказваюць так часта, як у гэтым горадзе...

Знішчаюць гаспадарку ☞ 4

Мікалай Лук'янюк

Гаварылася таксама, што унійныя нормы ад сакавіка забароняць сялянам продажу сельскагаспадарчых прадуктаў: малака, смятаны, сыру, масла на гарадскіх, пасёлкавых „рыначках" з-за таго, што не плацяць падаткаў...

Якім быць Музею ў Гайнаўцы ☞ 4

Юрка Харкевіч

Цікавыя, свежыя формы пераказу думаю, далі б пажадальна пазітыўныя вынікі. Добра паслужыць таксама рэактывацыя кіно ў арыгінальнай, беларускамоўнай версіі. Праводзіў жа гэта ў мінулым па вёсках Віктар Бура...

БАС выбіваецца з падполля ☞ 10

Татка Стэп

Здольнасці ў Ілоны Карпюк вялікія. Доказам таму апошняя падзея культурнага маштабу ў жыцці горада Беластока. 29 лютага ў кінатэатры „Форум" адбылася прэм'ера фільма „Osiemnaście" і мушу сказаць, што ніколі мне асабіста не ўдалося пачуць столькі пахвал наконт БАСу, „Басовішча" і самой Ілоны Карпюк. І ўсе тыя словы сказалі не абы-хто, толькі прадзюсер, рэжысёр і акцёры фільма...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Уладзімір Парфяновіч быў шматразовым чэмпіёнам свету і Еўропы, 17-разовым пераможцам пяршынстваў Савецкага Саюза. Пасля сканчэння выступаў нейкі час трэніраваў, потым усё актыўней займаўся грамадска-палітычнай дзейнасцю, стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. Сёння адзін з вядомых беларускіх палітыкаў, уваходзіць у парламенцкую апазіцыйную групу „Рэспубліка"...

9 770546 196000

Дружба атручаная газам

Адносіны паміж Расіяй і Беларуссю пасля 18 лютага г.г., калі кампанія „Газпрам" спыніла на нейкі час пастаўкі газу ў Беларусь, увайшлі ў новую стадыю — „надоўга атручаную гэтым газам", як акрэсліў яе прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Аналітыкі згодны ў тым, што пасля газавага скандалу іміджавыя страты Расіі і яе кіраўніцтва будуць у беларускім грамадстве намнога большыя, чым урон нанесены вобразу Лукашэнкі-інтэгратара.

Беларускі бок вуснамі свайго прэзідэнта прыпыненне паставак газу назваў актам тэрарызму на самым высокім узроўні. У адказ расійскае Міністэрства замежных спраў выступіла з вострай заявай, абвінаваціўшы Лукашэнку ў адказнасці за сістэмныя памылкі ва ўнутранай і замежнай палітыцы, якія тармозяць сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі і давялі да яе ізаляцыі на міжнароднай арэне. „Справакаваўшы крызіс вакол паставак расійскага газу, — пішацца ў петыцыі МЗС РФ, — А. Г. Лукашэнка такім чынам спрабуе адхіліць ад сябе крытыку і перакінуць адказнасць за свае памылкі на Расію". Беларускае знешнепалітычнае ведамства ў сваю чаргу адгукнулася заявай аб „перавернутай" логіцы расійскай петыцыі.

Беларускі бок вуснамі свайго прэзідэнта прыпыненне паставак газу назваў актам тэрарызму на самым высокім узроўні...

Вайна на словы працягваецца на старонках беларускага друку. Напрыклад, у газеце „7 дней" Віктар Нікольскі прызнаецца, што доўга думаў ці пісаць крытычна пра Уладзіміра Пуціна — прэзідэнта дружалюбнай краіны, з якой беларусы чыстасардэчна хочуць заключыць брацкі саюз. Аднак узяўшы пад увагу „мухі і катлеты", абвінавачванні ў жаданні карыстацца энергарэсурсамі „на халяву", а таксама выпад Пуціна ў адрас Леніна і Сталіна, публіцыст не стрымаў і стаў параўноўваць вынікі дзейнасці згаданых савецкіх правадыроў з чатырохгадовым плёнам прабывання на Крамлі цяперашняга прэзідэнта.

Атрымаецца, піша ён, што Ленін стварыў Саюз, які потым стаў звышдзяржавай, а Пуцін ужо чатыры гады не можа разабрацца, дзе мухі, а дзе катлеты, у выніку чаго Саюз Расіі і Беларусі топчацца ў месцы. Сталін у сваю чаргу прыняў краіну з сахой і пакінуў з ракетна-ядзерным шчытом, а Пуцін прыняў краіну з ракетным падводным крэйсерам „Курск", але ўтапіў яго ў Баранцавым моры. Прыняў ён таксама краіну з касмічнай станцыяй „Мір", але ўтапіў яе ў Ціхім акіяне. Калі справы пойдуць так далей, то на канец другога прэзідэнцкага тэрміну Расія зноў застанецца з сахой, злавесна прарочыць мінская праўрадавая газета. Падкрэслівае яна яшчэ, што Беларусь, якая пры Леніне атрымала незалежнасць, Пуцін намерваецца ўключыць у РФ у якасці суб'екта федэрацыі.

Рэзкія выказванні прэзідэнта Лукашэнкі па тэлебачанні ў адрас Расіі, непрыхільныя ёй ацэнкі ў дзяржаўным друку могуць пахіснуць веру ў дружалюбнасць суседняй брацкай дзяржавы нават у зацятых прыхільнікаў інтэграцыі. Расійскі бок, як мяркуюць аналітыкі, будзе весці сябе стрымана да прэзідэнцкіх выбараў, якія адбудуцца ў РФ 14 сакавіка г.г. Пасля цярпенне можа лопнуць. Аднак газавы канфлікт і яго асвятленне ў дзяржаўных СМІ, здаецца, могуць усвядоміць беларускаму грамадству ўсе тыя пагрозы для суверэнітэту краіны, пра якія гадамі пісала нелюбімая ўладай апазіцыйная прэса.

Пасля „газавай" атакі „Газпрама" — якую прэзідэнцкая „Советская Белоруссия" назвала разбоем — беларускі бок узяўся за праблему транзіту. У 2003 г. транзіт расійскага газу праз тэрыторыю Беларусі склаў 17 працэнтаў ад агульных экспартных паставак „Газпрама" ў далёкае і блізкае замежжа. Як паведаміла ў пачатку лютага „Звязда", расійскі бок хутка задаволіў патрабаванні Беларусі аб фактычна двухразовым павышэнні цаны транзіту газу з пачаткам гэтага месяца.

Аказваецца, самой дружбы для збудавання партнёрскіх міждзяржаўных эканамічных адносін недастаткова. Трэба памятаць аб інтарэсах, перш за ўсё сваіх.

Віталь Луба

Краіна малочных рэкаў

За справай скандалу з газам шмат хто ўсведаміў сабе, што Беларусь нешта значыць у еўрапейскай эканоміцы. Раней цераз Беларусь праходзілі чужыя арміі, пакідаючы за сабой руіны, папялішчы і сотні тысяч ахвяр з ліку мясцовага насельніцтва. У другой палове XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі былі пракладзены нафтаправоды, газаправоды, дарогі спалучаючыя ўсход з захадам кантынента. Геаграфія ўпершыню магла б працаваць у карысць насельніцтва. Аднак цуд не адбыўся. На заходняй мяжы Беларусі пачала вырастаць жалезная заслона, якая затармазіла рух людзей, тавараў і ідэй.

Кашмарна брудным і знішчаным цягнікам Кузніца-Беластоцкая — Гродна ездзяць амаль выключна гродзенскія кантрабандысты. Гэта пастаянны калектыў добра арганізаваных людзей, які цалкам дамінуе над мытнымі службамі. Ахвярай гэтых апошніх бываюць найчасцей выпадковыя пасажыры, якія са страхам у вачах правозяць дзве бутэлькі гарэлкі. Пуставаты гродзенскі вакзал ажывае толькі падчас прыезду цягніка з Польшчы.

Чым далей ад Гродна на ўсход, тым больш снегу. На перыферыі Мінска краявід больш напамінае Іркуцк чым еўрапейскую сталіцу. Ранкам снегу бывала вышэй вокан аўтамабіляў. Энергетычнага крызісу ў двухмільённым горадзе не адчувалася. Транспарт працаваў нармальна, а ў дамах была цёплая вада. Нідзе аднак у Беларусі не адчуваецца такога незадавальнення як у Мінску. Людзі зарабляюць няшмат і паводле афіцыйных даных палова грамадства павінна памерці ад голаду. Большасць аднак дзейнічае ў г.зв. ценявой зоне. Некаторыя нават не скрываюць, што іх афіцыйная плата гэта толькі каля 20 працэнтаў усяго прыбытку.

У крамах Мінска цэны большасці тавараў вышэйшыя чым у Польшчы. У барах і рэстаранах вышэйшыя нават на сто працэнтаў. Аднак вечарам цяжка знайсці там свабоднае месца. Дамінуе моладзь, расійская папса. Старэйшым астаецца тэлебачанне.

Гледзячы 25 лютага вячэрняе выданне „Навінаў" можна было прыйсці да высновы, што галоўнай падзеяй у краіне таго дня быў візіт прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў лес каля Лагойска, дзе ў будучыні мае ўзнікнуць цэнтр лыжнага спорту. Палову перадачы прысвяцілі гэтай падзеі. Наступнага дня ў „Навінах" паказалі рэпартаж пра даярку, якая двойчы выйграла спаборніцтва па пастаўцы малака. Калі яна яшчэ і трэці раз стане пераможцам, атрымае ва ўзнагароду каляровы тэлевізар. Здымкі ў хляве з удзелам даяркі і яе кароў рашуча знеахвоцілі мяне выпіць купленае ў краме малако. Не ведаю толькі чаму кіраўніцтва тэлебачання ў так кампраметуючы спосаб прадстаўляе сваю краіну.

У Баранавічах лепей адчуваецца дух тае Беларусі, якая адлюстроўваецца ў літаратурных творах найбольш вядомых пісьменнікаў і карцінах мастакоў. Здаецца, нідзе ў краіне на слова сказанае па-беларуску не адказваюць так часта, як у гэтым горадзе. У крамах, гатэлі, рэстаранах вітаюць гасцей так ветліва як у заходнееўрапейскіх курортах. Прытым выглядала, што ветлівасць не была праявай меркантылізму, а толькі станоўчай рысай характару людзей гэтага кутка Беларусі. Засыпаныя снегам вуліцы Баранавіч, дзе дамінуюць драўляныя хаты пачатку XX стагоддзя, прадстаўлялі вобраз як з фільма пра царскую эпоху.

У цягніку Баранавічы — Гродна прысеўся барадаты, засушаны чалавечак у моцна падніпшчаных ботах-афіцэрках. Выглядаў на бамжа, але, як высветлілася ў размове, адчуваў сябе вельмі багатым. Пачаў размову ад аблаяння прэзідэнта суседняй краіны Леаніда Кучмы. Гаварыў на ўкраінскай мове і вяртаўся з пахавання сваяка з-пад Харкава. „Кіруючая Украінай банда, — заяўляў голасна, — прывяла да таго краіну, што людзі паміраюць ад голаду. Ужо трэці раз вяртаюся з пахавінаў сваякоў у гэтым годзе, — роспачна выліваў свае жалі. — Наш прэзідэнт Лукашэнка, — прадаўжаў, — гэта парадачны чалавек. Я маю тры тоны бульбы ў запасе, каглас вінаваты мне яшчэ 3 цэнтнеры, у мяне вялікая капіца сена, я магу гадаваць казу, гусей, індыкоў, свіней, пастаянна атрымліваю пенсію, маю на хлеб і на сігарэты. Буду заўсёды галасаваць на Лукашэнку, каб не здарылася так як на Украіне", — дэкларава ў украінец, які адчуваў, што пашанцавала яму ў жыцці, таму што жыве ў Беларусі.

З мінскай, інтэлігенцкай перспектывы Беларусь выглядае зусім інакш, чым з пункту гледжання жыхара падваўкавыскай вёскі. Паміж імі выступае краіна ў неакрэсленай колькасці колераў і адценняў, якіх не пабачыць ніколі журналіст з Польшчы, прыязджаючы ў гэтую краіну з комплексам чалавека вялікай цывілізацыі. Таму тое, што можна пабачыць, пачуць, ці прачытаць у польскіх СМІ пра Беларусь няшмат мае супольнага з тамашнім рэальным светам.

Яўген Міранові́ч

Абяцанні і дэкларацыі

Няшмат што вынікла з другой сустрэчы прадстаўнікоў нацыянальных і этнічных меншасцей Падляшскага ваяводства з уладамі рэгіёна, прадстаўнікамі Міністэрстваў унутраных спраў ды культуры.

На сустрэчу не прыбыло шмат запрошаных прадстаўнікоў трыццаці меншасных арганізацый альбо паявіліся асобы замяшчаючыя шэфаў гэтых таварыстваў і звязаў. Прадстаўнікі найбольшых арганізацый літоўцаў і беларусаў маўчалі.

Ваявода Марэк Стшалінскі заклікаў, каб рашыцца, ці такая формула павінна быць пастаяннай формай кантактаў меншасцей з уладамі. Прытым падкрэсліў:

— Папярэдняе спатканне [год таму — М. Х.] скансумавала праблемы.

Віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі, заадно ад нядаўна кіруючы ў гэтым ведамстве калектывам па справах меншасцей Павел Дакоўскі ўспомніў, што ў Польшчы ад нядаўна абавязвае Еўрапейская карта рэгіянальных і меншасных моў, якая акрэслівае прынцыпы карыстання няпольскімі мовамі ў судах, установах і г.д. Не скрываў ён гонару ад ажыццяўлення г.зв. ромскай праграмы, якая, як адзначыў, гарантуе ромам жыццё ў адкрытым грамадстве. Заявіў таксама, што ўрад пазітыўна ставіцца да Закону аб меншасцях, над якім працы працягваюцца ўжо дванаццаць гадоў:

— Змесціцца ў ім каталог правоў, які будзе трактаваць аб роўнасці грамадзян і прэферэнцыйнасці меншасцей, акрэсліваць прынцыпы карыстання ва ўстановах дапаможнымі мовамі і ўжывання падвойных назваў вуліц і мясцовасцей, а таксама прынцыпы фінансавання меншасных мерапрыемстваў, функцыянавання меншаснай праблематыкі ў публічных радыё і тэлебачанні ды адукацыі.

Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі задэкларава ў „гатоўнасць і адкрыццё на прапановы меншасных мерапрыемстваў" і заахвочваў падаваць заявы на датацыі. Пры нагодзе ваявода Марэк Стшалінскі запэўніваў, што ёсць магчымасць арганізацыі пры Ваяводскай установе абучэнняў для меншасных арганізацый, якія хочуць хадайнічаць за еўрасаюзныя грошы м.ін. з праграмы Innterreg 3 A, звязанай з фінансаваннем рэгіянальнага трансгранічнага супрацоўніцтва і іншай, якая датычыць падтрымкі турыстычных мерапрыемстваў. Апрацавання праграмы, датычнай сродкаў, якімі можна будзе карыстацца пасля ўваходу Польшчы ў ЕС, патрабаваў Станіслаў Станкевіч, шэф Звязу ромаў. Прадстаўнікі Звязу ўкраінцаў Падляшша запрапанавалі, каб узнік у Беластоку Цэнтр меншаснай адукацыі і культуры, які быў бы фінансаваны галоўным чынам са сродкаў Еўрасаюза пры падтрымцы Падляшскай маршалкоўскай установы.

Выліканы да выказвання старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства, а заадно член ваяводскай управы, адказны за культуру і асвету, дэпутат Сейма папярэдняга склікання, Ян Сычэўскі сказаў:

— Працягваючыся дванаццаць гадоў працы над Законам аб меншасцях маем права ўспрымаць як праяву злой волі з боку палітыкаў.

Закрануў ён таксама справу функцыянавання Беларускага музея ў Гайнаўцы, які ўжо павінен пачаць сапраўдную адукацыйна-культурную дзейнасць.

Абагульняючыя вывады з сустрэчы прагучэлі ў выказванні прадстаўніцы Звязу татараў:

— За тое, што атрымліваем, дзякуем і спадзяемся на падтрымку ў будучыні.

Найбольшы канкрэт прагучаў з вуснаў падляшскай куратар асветы Зофіі Транцыгер-Кочук:

— Школа ў Арэшкаве не будзе ліквідавана.

Незалежна ад запрашэння, на сустрэчу не прыбыла віцэ-старшыня сеймавай камісіі па справах меншасцей Генавефа Вісьнёўская. Не было таксама падляшскіх парламентарыяў.

Мацей Халадоўскі

Хопіць сказаць, што, калі б Беларускі народны фронт сказаў: мы не хочам, каб у Беларусі ўзнікалі польскія школы, дык ніводная б не паўстала. Мы змаглі дагаварыцца з беларусамі ў гэты цяжкі час...

Снікерса недастаткова

ТАДЭВУШ ГАВІН — заснавальнік і першы старшыня Саюза палякаў Беларусі. У Падляшскай ваяводскай бібліятэцы ў Беластоку прэзентаваў сваю найнавейшую кнігу „Zwycięstwa i porażki". Раней наведаў нашу рэдакцыю. Ягоны візіт сарганізаваў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча — Беларусь. У сустрэчы ў бібліятэцы прыняў удзел віцэ-старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандр Дабравольскі. Песні спяваў вядомы бард з Беларусі Віктар Шалкевіч.

З Тадэвушам Гавіным размаўляе Мацей Халадоўскі.

— Што інспіравала Вас да напісання кнігі „Zwycięstwa i porażki", такіх абшырных успамінаў?

— Па-першае, я хацеў ясна падсумаваць вынікі дзейнасці Саюза палякаў Беларусі пры маім кіраўніцтве, каб новыя дзеячы з таго, што станоўчае, бралі прыклад і каб не рабілі такіх самых памылак.

— Прызнаецеся ў кнізе, што трапілася Вам шмат памылак. Якія былі найважнейшыя, якія ляжаць цяжарам на паляках у Беларусі?

— Я хутчэй назваў бы іх не памылкамі, а паразамі. Перш за ўсё гэта факт, што не ўдалося нам пераканаць лукашэнкаўскія ўлады, каб узнікла польская школа ў Навагрудку. Шмат было з нашага боку пымылак. Не змаглі мы даказаць лукашэнкаўскім уладам, што мы рашучыя, што мы разам, уз'яднаныя, і ўсе таго хочам. Хапіла ў нашых шэрагах, а нават у маім найбліжэйшым атачэнні, людзей, якія не разумеюць спраў такога тыпу. Можна некаторых з іх назваць нават калабарантамі, якія, будучы блізка, пагаджаліся са мною, што так трэба, а пазней рознымі каналамі ўплывала на іх улада і тады яны публічна адыходзілі ад раней прынятых рашэнняў. Было відаць, што мы ў гэтай і да яе падобных справах — падзеленыя. І гэта нас аслабляла. Другая справа. Мая адстаўка з пасады старшыні СПБ была вырашана слушна. Немагчыма бясконца выпаўняць такую функцыю. Гэта вельмі цяжкая праца. Я рашыў, што трэба даць магчымасць тым, хто мяне крытыкаваў. Сёння бачу, што, аднак, спосаб, у які я гэта зрабіў, быў агромнай памылкай. Не трэба было адмаўляцца, а пачакаць ды склікаць з'езд. Зрабіў усё, а новыя ўлады перанялі палітыку, якую я вёў. Адышоў я зарана. Не меў тады ніякага ўплыву на тое, хто будзе кіраваць Саюзам. І цяпер вось сітуацыя такая, што саюз не такі напорысты як раней, не ёсць такой аўтарытэтнай арганізацыяй, як пяць гадоў таму. Няма таго супольнага фронту змагання палякаў на Беларусі за польскія школы. Саюз не мае падтрымкі з боку беларускіх арганізацый і дэмакратычных партый. Усё таму, што Саюз палякаў таксама іх не падтрымлівае ў змаганні за незалежную і суверэнную Беларусь, захоўванне правоў чалавека і ўрэшце таксама і правоў меншасцей.

— Ці ваша — грамадзяніна Беларусі — прадзяржаўнае мышленне перашкаджала ў дзейнасці дзеля польскай меншасці?

— Якраз наадварот. Мая ангажаванасць у Беларусі ў беларускія справы, значыць, падтрымка палітычных партый і дэмакратычных арганізацый узмацняла аўтарытэт СПБ, а, па-другое, узамен атрымлівалі мы большыя карысці, чым беларусы. Хопіць сказаць, што, для прыкладу, калі б Беларускі народны фронт сказаў: мы не хочам, каб у Беларусі ўзнікалі польскія школы, дык ніводная б не паўстала. Мы змаглі дагаварыцца з беларусамі ў гэты цяжкі час і даказаць ім, што мы, як польская меншасць, не стваралі б ім ніякай пагрозы. Няма ж гаворкі аб, напрыклад, вяртанні Гродна ў Польшчу ці іншыя справы з нацыяналістычнай афарбоўкай. Мы ж там нарадзіліся, жывем і хочам карыстацца належнымі нам канстытуцыйнымі правамі. Нічога апрача гэтага. Ангажаванасць палякаў і іх арганізацый у дэмакратычнае жыццё ў Беларусі прыносіла і будзе прыносіць карысці польскай меншасці, якая там пражывае.

— Але ці гэта ёсць толькі ваша думка, ці таксама і большай групы палякаў? Ці, для прыкладу, Польскія дамы ў Беларусі адкрытыя на дзейнасць дэмакратычных няўрадавых арганізацый?

— На жаль, не. Мушу прызнацца, што новыя ўлады Саюза гэтага не разумеюць. Уся іх палітыка за польскасць у Беларусі зводзіцца да будавання польскага гета. Гэта вядзе нікуды. Зводзіцца гэта вось да чаго: калісь былі мы просьбітамі і будзем імі ў будучыні. За такое думанне палякі не здабудуць для сябе пазіцыі ў беларускай дзяржаве. Каб быць партнёрам для беларусаў, якія цяпер сядзяць у арыштах, змагаюцца за незалежную і дэмакратычную Беларусь, плацяць вялікія штрафы за тое, што хочуць, каб Беларусь была іншай дзяржавай, калі зачыняюцца іхныя газеты, ліквідаваны іхныя грамадскія арганізацыі, нельга толькі прыглядацца. Калі мы не будзем ангажавацца, толькі сабе ўзірацца і не будзем супрацоўнічаць бяспраўным дзеянням улад, то будзем у Беларусі прыгавораны існаваць на абочыне грамадскага жыцця.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— Калі гаворка аб адносінах палякаў да Беларусі, то не хопіць прыехаць да „biednej hołoty polskiej" на ўсходзе, прывезці паношанае адзенне і даць у падарунку снікерс; такія дзеянні да нічога добрага не прывядуць...

— Шмат маладых палякаў з Беларусі выязджае па навуку за мяжу, галоўным чынам у Польшчу. Шмат з іх не вяртаецца на радзіму. Што Вы скажаце на гэты конт?

— Гэта наша трагедыя. Па вышэйшую адукацыю выязджае ў прынцыпе наша найлепшая моладзь. Ну, але гэта не такое драматычнае. Усё ж, шмат з іх вяртаецца. Для прыкладу, мой сын. Закончыў Ягелонскі універсітэт, вярнуўся, не хоча з'язджаць з Беларусі, ангажуецца ў грамадска-палітычнае жыццё. Вось такія паводзіны добра прадказваюць на будучыню. У свой час прапанаваў я польскаму міністэрству адукацыі, каб выпрацаваць нейкія механізмы, якія б гарантавалі тое, што выязджаючыя па навуку мелі б нейкія абавязацельствы ў адносінах да польскай меншасці ў Беларусі, бо ж на яе заяву яны выехалі. Усё ж, я б не перабольшваў гэтай праблемы.

_ Як Вы, на сённяшні дзень, ацаняеце шанцы развою ў Беларусі школьніцтва польскага, але і беларускамоўнага?

— Усё ж, беларусы — у лепшай сітуацыі. Вядома, кіруе Лукашэнка і іншыя, якія ігнаруюць беларускую мову. Усё ж гэта — часовае. Раней ці пазней да ўлады дойдзе новая генерацыя людзей, якія думаюць іначай, у якіх прабеларускі і прадзяржаўны напрамак. Так, як было на пачатку дзевяностых, калі паступова ўводзілася беларуская мова ў першыя класы. З часам і так гэтыя школы стануць беларускамоўнымі. Цяпер і ў будучыні мы, палякі, будзем мусілі даказаць, што і нам патрэбныя школы. Можа, у будучыні будзе з гэтым лягчэй, калі ў сённяшняй цяжкай палітычнай сітуацыі дакажам беларусам, што мы — з імі і хочам таго самага.

— Што чакае Беларусь у найбліжэйшы час?

— Я — аптыміст. Хоць кажуць, што ў Беларусі слабая і падзеленая апазіцыя, і няма з кім размаўляць апроч Лукашэнкі, гэта няпраўда! Ёсць мноства людзей, якія думаюць іначай, якія хочуць змяніць гэтую палітычную сістэму, накіраваную супраць людзей. Час змен не такі адлеглы. Канфлікт паміж Пуціным і Лукашэнкам, пасля чарговага выбару Пуціна будзе паглыбляцца надалей. Парламенцкія выбары ў Беларусі ўлады несумненна схочуць сфальшаваць. Пасля чакаюць нас прэзідэнцкія выбары. Калі б нават ім удалося сфабрыкаваць парламенцкія выбары і не выкліча гэта большага абурэння, то ўжо сёння на вуліцы відаць простым вокам, што Лукашэнка можа разлічваць толькі на нязначную падтрымку. Калі сфабрыкуюць выбары, то нявыключана, што Беларусь чакае грузінскі варыянт. Людзі выйдуць на вуліцы супрацівіцца мане. Гэтую ўладу людзі змятуць!

— Як Вы ацэньваеце польскую палітыку ў адносінах да Беларусі?

— Польшча, насуперак лозунгам, не надае большага значэння будаванню ў Беларусі адкрытага грамадства. Польскія прадстаўнікі павінны кантактавацца з няўрадавымі арганізацыямі. Сёння ў Гродне мой калега Мікола Маркевіч выдае газету „День", адзіную друкаваную на Гродзенскую вобласць па-беларуску. Ледзь зводзіць канцы з канцамі і ніхто ў Польшчы не хоча яму памагчы. Калі Польшча кажа, што хоча мець Беларусь — усходнюю суседку з адкрытым грамадствам, людзьмі ёй прыязнымі, а няма ў той самы момант нікога ў Польшчы, хто хацеў бы падтрымаць такіх людзей як Маркевіч, які хоча будаваць тое адкрытае грамадства, то я сумняваюся, ці тая палітыка — слушная. Не хопіць толькі казаць, што не падтрымліваем рэжым. Калі гаворка аб адносінах палякаў да Беларусі, то не хопіць прыехаць да „biednej hołoty polskiej" на ўсходзе, прывезці паношанае адзенне і даць у падарунку снікерс; такія дзеянні да нічога добрага не прывядуць. Трэба часцей ездзіць у Беларусь і сустракацца з палякамі. На месцы памагаць ім пазбыцца комплексаў, вучыць таго, як быць у Беларусі нармальнымі грамадзянамі, каб хацелі яны ангажавацца ў палітычную дзейнасць, самаўрадавыя выбары. Каб хацелі разам кіраваць той краінай, ведалі, што патрэбны яны дэмакратыі, што яны грамадзяне не другой катэгорыі.

Размаўляў Мацей Халадоўскі

Прыгранічны турыстычны абмен

У Чаромхаўскай гміне працуюць два пагранічныя пераходы з Беларуссю: дарожны Полаўцы — Пяшчатка і чыгуначны Чаромха — Высока-Літоўск. Паколькі гэтыя пункты не карыстаюцца статусам міжнародных, дык і лік перасякаючых мяжу адносна невялікі. Чыгуначны пераход быў адкрыты летам 1992 года. Паводле раскладу язды павінны былі курсіраваць два цягнікі. Практычна курсіраваў адзін. Пачаткова Беласток — Чаромха — Брэст, а зараз Чаромха — Высока-Літоўск. Дарожнаму пераходу Полаўцы — Пяшчатка ўжо дзесяць гадоў. Гадавіна адзначалася 6 снежня 2003 г., але абышлося без шумных цырымоній. Для пагранічнікаў і мытнікаў быў гэта звычайны дзень працы. У перыядзе дзесяці гадоў праз Полаўцы — Пяшчатку перасякло мяжу дзесяць з палавінай мільёнаў турыстаў. Адно ў першым паўгоддзі 2003 г. лік склаў 308 тысяч. У асноўным, дарожным пераходам карыстаюцца беларусы, паколькі пасля ўвядзення візавага рэжыму беларускі бок абмяжоўваўся да выдавання кароткатэрміновых (на тры праезды) візаў. Палякі складалі адно пяціпрацэнтную частку перасякаючых мяжу. Але, як сказаў мне камендант Чаромхаўскай пагранічнай стражы, гранічны рух у Полаўцах вяртаецца да нормы. Многія чарамшане наракаюць, што цана візаў надта высокая. Але спадзяюцца на ільготы ў 2004 годзе, паколькі ідзе гаворка, што жыхарам прыгранічнай зоны ў радыусе 50 км можна будзе выязджаць у Беларусь без візы, карыстаючыся адно пашпартам. Хай бы закон гэты пачаў чым хутчэй абавязваць.

Уладзімір Сідарук

Новае ў Нараўцы

26 лютага адбылася сесія Гміннай рады ў Нараўцы (Гайнаўскі павет). Дэпутаты аднагалосна ўхвалілі бюджэт гміны на 2004 год. Сёлета на тэрыторыі Нараўчанскай гміны пакладуць асфальт на дарогах, між іншым, з Лешукоў у Сушчу ды з Нараўкі ў Янова. Ваду з крана атрымаюць жыхары хутароў Новага Ляўкова і Тарнопаля, а каналізацыю жыхары Заблотчыны, Плянты і некаторых вуліц у Нараўцы.

У гэтым годзе на беразе Семяноўскага возера, у Старым Двары, пабудуюць мол, спортпляцоўкі (м.інш. тэнісны корт, пляцоўку для валейбола), стаянку для аўтамабіляў, гастранамічныя ларкі і прыбіральні.

31 жніўня 2004 года будуць закрыты школы ў Семяноўцы і ў Старым Ляўкове, у якіх вучыліся дзеці 0-III класаў. Будуць іх вазіць школьныя аўтобусы ў Нараўку. З часам у апусцелым школьным прасторным будынку ў Старым Ляўкове мае быць Дом для састарэлых, а ў Семяноўцы г.зв. „зялёная школа" з начлежнымі месцамі.

Улады гміны запланавалі г.зв. „белую нядзелю" (прыедуць дактары спецыялісты, каб абследаваць хворых у вясковай амбулаторыі) у маі або ў чэрвені г.г. **(яц)**

Унійныя нормы давядуць сельскую гаспадарку да заняпаду, а Захад будзе ў нас прадаваць свае тавары...

Знішчаюць гаспадарку

Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

Н-у-у-у, усе ў Еўрасаюз..!

20 лютага г.г. з тэлеперадачы „Аграбізнес" я даведаўся, што ад 1 сакавіка на пунктах скупкі жывёлы не прымуць свіней, калі не будуць яны пазначаны тушавым нумарам. Гаварылася, што тушавы штамп павінен купіць кожны гаспадар, а ён каштуе... 400 зл. Раілі сялянам, каб супольна, цэлай вёскай, купляць гэты штамп, тады абыдзецца намнога танней. На маю думку, такое прыстасаванне павінна быць у кожным пункце скупкі жывёлы, так як было гэта раней — калі прынялі парсюка, выбівалі нумар на вуху і ўсё было добра.

Гаварылася таксама ў тэлеперадачы, што будуць забараняць продажу парасят на кірмашах, якія не адпавядаюць еўразаюзным стандартам, значыць, што на кірмашы павінна быць пабудавана адпаведная стаянка для лекара-ветэрынара, каб ён мог у добрых санітарных умовах (з бягучай вадой) агледзець парасяты ці яны здаровыя. На маю думку, можна гэта зрабіць у Міхалове, бо там пад рынак выдзелены і агароджаны пляц. У Заблудаве гмінныя ўлады таго не зробяць, бо рынак, дзе цяпер прадаецца збожжа і парасят, знаходзіцца за мястэчкам, насупраць праваслаўных могілак, у ямках і там ніхто парадку не зробіць. Хіба, што бурмістр будзе такі шчодры і вылажыць вялікія грошы на яго ўпарадкаванне. Думаю, не пад сілу будзе і войтам іншых гмін дастасаваць рынкі да еўрасаюзных стандартаў.

Гаварылася таксама, што ад сакавіка забароняць сялянам продажу сельскагаспадарчых прадуктаў: малака, смятаны, сыру, масла на гарадскіх, пасёлкавых „рыначках" з-за таго, што не плацяць падаткаў. Мне здаецца, што калі гэтыя законы ўвойдуць у жыццё, тады падляшскіх малых гаспадарак намнога паменшае. Паводле мяне, гэта давядзе сельскую гаспадарку, і прамысловую таксама, да заняпаду, а Захад будзе ў нас прадаваць свае тавары.

Мікалай Лук'янюк

Андрэй Самасей

Едзем у новую Еўропу

Яны ўжо багацеі, не халопы,
Свая ім непатрэбная айчына.
Едуць яны ў магутную Еўропу
На дарагіх шыкарнейшых машынах.

Айчынны край быў ім нібы лімонам,
Што выціснулі оптам канчаткова.
Яны ўжо надта важныя персоны,
І месца ім якраз у свеце новым.

Там знойдуць крэслы для сваёй выгоды
І поўнае багатае карыта.
Жыць будуць прыпяваючы заўсёды,
Стануць лічыцца там заможнай світай.

А ўвесь народ, сапраўдныя халопы,
Што так змагаецца з штодзённаю бядою,
Калі ж ён дойдзе да слаўнай Еўропы,
Марудна ідучы там пехатою?

Якім быць Музею ў Гайнаўцы?

Нізка трэба пакланіцца ініцыятыўнай групе пабудовы Музея. Не па іх віне не ўсё да канца ўдалося. Доўга, доўга аб'ект будаваўся, фінансавы балаган, фармальна-праўныя недаразуменні. Гэта ўсё не стварыла добрай атмасферы вакол Музея. З перспектывы часу відаць, што будуючы забыліся — мы ўсе — пра яго ідэю, пра той пачатак пачаткаў, чым ён мае быць, што рэалізаваць, хто рэалізацыяй будзе займацца і якімі сродкамі? Адкуль яны маюць паступаць? Ніводная справа не прыведзена да канчатковага вырашэння. А справа, здаецца, простая. Музей устанавіўся цэнтрам культуры беларускай меншасці. Меншасць, як кожная іншая ў краіне, карыстаецца канстытуцыйнымі правамі на незалежнасць і свабоднае развіццё, гарантаваныя дзяржавай. Калі так, тады самы пэўны, бо незалежны, мецэнат, у тым фінансавы, павінен прыналежаць дзяржаве? Падмацоўваецца ўсё таксама правамі Еўрасаюза ў адносінах да развіцця самастойнасці нацыянальных меншасцей. Думаю — там таксама трэба шукаць фінансавай падтрымкі. Філіяльная залежнасць музея, напр. ад Акруговага музея — пагражае ўтратай яго незалежнасці і яго арыгінальнасці. Затраціцца яго непаўторнасць, свежасць ідэі. Музей — як цэнтр культуры — датычыць нас усіх — і тых у краіне, і за яе рубяжамі — а калі так вялікі маштаб, тады і вялікі размах, бо як сказаў Мікалай Бушко — „вялікаму каню, вялікі хамут". А калі так, тады яшчэ і справа ў падборцы людзей — выпадковыя, непадрыхтаваныя не павядуць работы на добрым узроўні, а яе трэба пачынаць ад пачатку — ад самага простага: рэгістрацыі экспанатаў, іх каталагізацыі, апісання, кансервацыі, вышукання новых, арыгінальных, што патрабуе энергічнай працы ў асяроддзі. Не датычыць гэта толькі краіны, але ўсіх найменшых асяроддзяў у свеце, а перад усім тых, з якіх паступілі фінансы на пабудову. Мы гэта ім вінаваты, нельга пакідаць іх самім сабе. Зацікаўленнем трэба абняць меншасна-беларускую абраднасць, вершаваную, песенную і іншую, звязаную з намі ад нараджэння да смерці. Перадумаць пры гэтым спосабы запісу — фанатэка, фільм, іншыя формы? Гэта патрабуе таксама сістэматызацыі, архіўнай апрацоўкі, спосабу захавання, доступу да іх, выкарыстання ў асяроддзі. Да прадумання тут справа ўвядзення заняткаў па фалькоры ў пачатковыя і сярэднія школы з беларускай мовай навучання (у якой форме — да дыскусіі). Важна, каб маладыя пазнавалі „сок зямлі сваёй", але і не толькі маладыя. Вялікае зацікаўленне абраднасцю, паказаў, здаецца, мінулагодні лістападавы агляд абраднасці ў Гайнаўскім доме культуры. Цікавыя, свежыя формы пераказу думаю, далі б пажадальна пазітыўныя вынікі. Добра паслужыць таксама рэактывацыя кіно ў арыгінальнай, беларускамоўнай версіі. Праводзіў жа гэта ў мінулым па вёсках Віктар Бура — было добра! Амаль жа нічога не ведаем пра беларускае кіно, а так нельга. Прадуманню таксама паддаю тэму рэактывацыі калектыву такога маштабу як „Лявоніха". Фестывалі беларускай песні паказваюць умеласць маладых спяваць і танцаваць. Проста кажучы, пры музеі трэба заснаваць эстраду ў шырокім значэнні гэтага слова, а аб'ект Музея — добрая ёй база. У цыклічныя мерапрыемствы культурнага абшару можна ж упісаць рознага роду турніры з выкарыстаннем прадметаў даўняй сельгаспадаркі (калаўроткі, цапы, сярпы, кросны і т.д.). Спалучаць жа гэта можна з вечарамі, напр. выпеку хлеба, ці ўвогуле вечарамі даўніх вясковых гасцін, напр., аднаўлення — у цэласці — беларускага, вясковага вяселля. І фальклор ажыве, і забава добрая, а самае важнае — асяроддзе інтэгруецца. А гэта важна, каб не чужацца, а братацца. Гэтаму павінен служыць Музей і гэтаму няхай служыць, хай спалучае, не дзеліць.

Форма артыкула не дазваляе на шырокае апрацаванне канцэпцыі працы Музея, але дадаткова, каб падкрэсліць важныя, па-мойму, праблемы яе, некаторыя напрамкі, якія дазволяць разварушыць крышку соннае наша асяроддзе. У гэтым бачу самае важнае заданне Музея, а людзі — арганізатары, умельчакі, смекалісты — знойдуцца... Ага, і яшчэ адно — „згода будуе — нязгода — руйнуе"... Давайце памятаць і брацца за згоду... ой, выбачайце — работу!

Юрка Харкевіч

Нашы найлепшыя пастаўшчыкі ўжо ў змозе пастаўляць г.зв. „вунійнае” малако...

Магчымасці і шансы ёсць

Размова са старшынём Акруговага малачарскага кааператыва ў Саколцы Фрыдэрыкам ШУБЗДАМ.

— 1 мая Польшча далучаецца да Еўрасаюза. Раскрыюцца некаторыя межы так для ўвозу, як і вывазу прадуктаў. Як Ваша прадпрыемства ставіцца да новай сітуацыі?

— Мне складана гаварыць пра новых пастаўшчыкоў на наш рынак. Мы гатовы да паставак на еўрасаюзны рынак, а наш завод у Дуброве-Беластоцкай — пакуль на польскі.

— Далучэнне суправаджаюць прамежкавыя перыяды: ці яны закрануць вас?

— Заводу ў Саколцы прамежкавыя перыяды непатрэбныя — мы трымаем еўрасаюзныя стандарты. Заводу ў Дуброве дзеля гэтага патрэбны яшчэ час. Мы шмат інвестуем, карыстаючыся сродкамі з фонду SAPARD — так у Саколцы, як і ў Дуброве. І нашы найлепшыя пастаўшчыкі не патрабуюць прамежкавых перыядаў, бо яны ўжо ў змозе пастаўляць г.зв. „вунійнае” малако. Але ёсць і такія сяляне, якім прамежкавы перыяд да канца 2006 года патрэбны. Пастаўшчыкі таксама карыстаюцца фондам SAPARD для ўсталявання ахаладжальных установак.

— Ці наша малочная прамысловасць задаволена акцэсійнымі дамоўленасцямі, ці мо нашы перагаворшчыкі нешта занядбалі?

— Мяркуем, што дабіліся яны замалой малочнай долі для нас. У ветэрынарнай справе ёсць шмат няясных сялянам праблем, напрыклад, малако „экстра” класа без ветэрынарнага пасведчання не лічыцца „вунійным” малаком.

— Ці рэкламаванне сакольскіх вырабаў Велі-Маці Ліндштрэмам скіравана польскаму ці мо замежнаму спажыўцу?

— Польскаму.

— Выхад на замежныя рынкі, а нават захаванне сваіх пазіцый, будзе патрабаваць пабольшанай натугі. Ці ваша прадпрыемства збіраецца злучыць сілы з кім іншым?

— У гэтай справе канцэнтрацыя вельмі важная. У 2002 годзе далучыўся да нас Акруговы малачарскі кааператыў з Дубровы-Беластоцкай, але патрэбная далейшая канцэнтрацыя. Я быў прыхільнікам аднае вялікае фірмы, якая б аб'ядноўвала ўсе малачарні нашага ваяводства. Аднак дзвюм вялікім прадпрыемствам — з Высокага-Мазавецкага і Граева — гэта не адпавядала. Наша прадпрыемства завяло кантакт з Гайнаўкай, але — пакуль — ён спынены.

— Няма атмасферы для гандлю з Беларуссю і ён адсутнічае.

— Як ваша прадпрыемства супрацоўнічае са сваімі пастаўшчыкамі? Ці ўсе яны справяцца з новымі патрабаваннямі?

— Некаторая частка не справіцца. Нядаўна праводзілі мы сустрэчы з тымі, што маюць свае рэзервуары і тымі, што здаюць звыш дзесяці тысяч літраў малака ў год. Прыходзіла многа народу і рашучая большасць іх зможа задаволіць якасныя і санітарныя патрабаванні. А як гэта далей складзецца — цяжка мне сказаць. Магчымасці і шансы ёсць і трэба намагацца каб з усім справіцца. Нашы службы, адказныя за сыравіну, ездзяць да гаспадароў, даюць падказкі. Ды і ў нашым прадпрыемстве маем крэдытны фонд на пазыкі дзеля дапамогі пастаўшчыкам задаволіць новыя патрабаванні. У мінулым годзе мы выдзелілі крэдыты вартасцю ў 2,2 мільёна злотаў.

— Якія вырабы прапануеце спажыўцам?

— Штогод уводзім 3-5 новых прадуктаў. Вось і цяпер прапануем чатыры новыя йагурты. Мадыфікуем таксама рэцэптуру сваіх вырабаў. У сённяшні час наша прадпрыемства выпускае звыш сарака відаў прадуктаў. Прадаем іх па цэлай Польшчы, найбольш у Варшаву, Сілезію, Трыгарад, Вармію і Мазуры, Шчэцін...

— З Саколкі недалёка ў Гродна. Ці ёсць нейкі рух у тым напрамку?

— Няма атмасферы для гандлю з Беларуссю і ён адсутнічае.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма паляка

Пасёлкавая замежная палітыка

Я — „пад уражаннем” аднае інфармацыі, якая абабегла беластоцкую прэсу. Вось у Беластоку можна будзе галасаваць на расійскіх прэзідэнцкіх выбарах. Спачатку я падумаў, што гэта журналісцкая качка альбо жарт. Аднак абвяржэнне не паступіла, а да першага красавіка далекавата. Найбольш здзіўляе тое, што, згодна з прэсавымі данясеннямі, расійскі выбарчы ўчастак змяшчаецца ў звычайным пасёлкавым клубе „Захэнта” на пасёлку Пяста. Не ведаю, хто гэта выдумаў і ці ведае аб гэтым адміністрацыя ў Маскве цяпер уладаючага ў Расіі і маючага найбольшыя шанцы на перавыбар прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, але, на мой погляд, гэтая ідэя тым не менш — кур'ёзная.

Выбары — найбольш сур'ёзная і найбольш дэмакратычная форма, якая вырашае аб лёсе паасобных дзяржаў, рознага роду арганізацый ды міжнародных структур. Разумею, што ў Беластоку і ваколіцах прабывае шмат расіян, гэтых з расійскіх грамадзянствам і правам на галасаванне. Аднак традыцыя ва ўсім свеце (калі не ўлічваць краін з дыктарскімі ўрадамі ці яшчэ іншымі недэмакратычнымі цягамі) — ствараць выбарчыя ўчасткі ў дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтвах і іншых г.зв. экстэрытарыяльных пунктах, такіх як караблі. Вось тая экстэрытарыяльнасць гэтых месцаў паказвае, што выбары на тэрыторыі другой дзяржавы застаюцца ўнутранай справай краіны, у якой праводзіцца тое галасаванне (у гэтым выпадку — Расіі). Не ўспамінаю тут аб палітычна-бытавой бестактоўнасці расійскага боку, а дакладней канкрэтных асоб з таго боку, якія стаяць за гэтай ідэяй. Здзіўляюся кіраўніцтву клуба, кааператыву, урэшце ўладам горада, наканец польскаму МЗС і ўраду, што дазваляюць на такі прэцэдэнт, а прынамсі не пратэстуюць і яму не супраціўляюцца.

Калі да гэтага дойдзе, Беласток стане славутым не толькі ў Польшчы, але і ўва ўсім свеце з *сабепанства*, места-дзяржавы, якое само сабе акрэслівае прынцыпы міжнароднага права і ўстанаўлівае пасёлкавую замежную палітыку. Думаю, што і кіраўніцтва „Захэнты” ў сваёй звышактыўнасці пайшло задалёка. А сама дзіўнае, што ідэя расійскіх прэзідэнцкіх выбараў на пасёлку Пяста прайшла без розгаласу.

На палях вялікага палітычна-бытавога жыцця. Першы раз ад многіх гадоў запаляваў у Польшчы манарх чужой, хоць сяброўска пастаўленай да нас дзяржавы — еўрапейскай, так сказаць, імперыі — кароль Іспаніі Хуан Карлас I. І пан кароль мае чым ганарыцца. Застрэліў ён зубра вагою ў 650 кілаграмаў, вядома, адзінага сярод старых і нямоглых. І тут, бачыце, такая прыкрасць у лакальным маштабе. Яго вялічаства не паляваў у Белавежскай пушчы, а ў вармінска-мазурскай — Барэцкай. А ж прыватнае паляванне караля Іспаніі ў белавежскіх лясах разрэкламавала б наш рэгіён і падняло б ягоны ранг па-за межамі Польшчы значна больш, чым мала трапныя прапановы правядзення ў Беластоку расійскіх пасёлкавых выбараў.

На канец. Вычытаў я нядаўна думку аднаго ваеннага стратэга: „Першая ахвяра кожнай вайны — праўда”. Але гэта ўжо іншая гісторыя, якая датычыць не толькі сітуацыі ў Іраку ці іншых гарачых кропках свету, але і малых войнаў, ведзеных агульнапольскімі і лакальнымі палітыкамі.

Мацей Халадоўскі

„Ніва” запрашае чытачоў выказваць свае меркаванні наконт пагрозаў і шансаў сялянскім гаспадаркам пасля ўваходу Польшчы ў Еўрапейскі Саюз. Тэма гэтая, як бачыце, балючая і хвалюючая.

Сялянскі клопат

Пункт скупкі жывёлы ў Нарве існаваў ад часу паўстання Гміннага кааператыва „Сялянскай самапомачы”. Спачатку быў гэта невялікі будынак, а пасля Гміннае праўленне ГС пабудавала прасторны, мураваны будынак, дзе адбывалася скупка свіней, быдла і коней. Пункт скупкі працаваў два разы ў тыдні, аднаразова прымалі пад 300 штук свіней і больш за 100 штук ялавічыны. Умовы для скупкі жывёлы былі добрыя, стаялі яны на бетоннай падлозе, у жалезных загарадах, рагатая жывёла была ўвязаная на ланцужках, каб не баролася. Усё было вельмі добра і гуманна.

Калі настала рыначная эканоміка, многія ГСы ўпалі і гэтак сталася з нарваўскім ГСам. Будынак скупкі жывёлы купіў быў спадар Сіліванюк і тут надалей прымалі жывёлу і ўсім сялянам было вельмі добра. Нядаўна прыехаў павятовы лекар ветэрынарыі з Гайнаўкі і закрыў пункт скупкі. Прычынай, мабыць, быў негуманны падыход да жывёлы (некаторыя, больш дасціпныя людзі, пасмейваліся, што Сіліванюк пашкадаваў грошай і не прыдбаў тапчаноў для вепрукоў, каб яны спакойна ляжалі чакаючы прыезду машыны). А, на маю думку, усё гэта дзеецца таму, што камусьці перашкаджае Усходняя сцяна і хоча, каб усю тэрыторыю аблясіць і людзей нашых перавярнуць у малпы. Што ж зробіш, цяпер з жывёлай трэба лепш абыходзіцца як з чалавекам. **(мл)**

Няма рады

Многа закалоту было наконт фіскальных кас у таксі. Не памаглі пратэсты шафёраў. Міністэрства фінансаў было няўмольнае: з пачаткам 2004 года таксісты абавязаны карыстацца фіскальнымі касамі. Здзелка неабходная дзеля змагання з ценявай эканомікай і несумленнымі шафёрамі, якія не плацілі належнага падатку і ашукоўвалі кліентаў. Вось, што я прыкмеціў у Беластоку.

Заказаў па тэлефоне таксі, каб праехаць з вул. Заменгофа на вул. Складоўскай. Пасля праезду запытаў колькі плачу. Шафёр адказаў: „Найменшая стаўка 5 зл., але даю дваццаць працэнтаў скідкі. Належыцца 4,64 зл.”. Інакш было, калі я вяртаўся назад. Махляр злупіў з мяне 7 злотых, не выдаўшы прытым чэка. Спаглядаў адно на мяне, прыплюшчыўшы вочы, як плаціў грошы (сумняваўся ці не спатрэбіцца мне чэк). А я пасаромеўся. Прызнаюся шчыра, што зараз шкадую. Нібы разважлівы, а дазволіў, каб падвялі мяне пад дурнога хату. Па-мойму, на прайдзісветаў і ашуканцаў няма ўправы. Ці ў таксі, ці ў краме знойдзецца чорная авечка, якая ўвесь статак аганьбіць, значыць, добрасумленных працаўнікоў. Вінаваты мы самі. Няма чаго саромецца. Трэба пільнаваць свайго кашалька, бо грош цяжка даецца! Варта аб гэтым памятаць. **(ус)**

Ганна Кандрацюк
zorka@niva.iig.pl

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Разумнікі з ПШ н-р 4 у Беластоку. Разам, настаўніца Аліна Ваўранюк і Кінга Тарноўская з Люблінскага універсітэта.

Хто важнейшы — дзяўчына ці хлопец?

І што думаеш пра святкаванне Дня жанчыны і Дня мужчыны? Які твой ідэал сяброўкі, сябры?

Голас узялі хлопцы з пятага класа ПШ н-р 4 у Беластоку.

— „Дзень жанчын" — непатрэбны, — лічыць **Мацек Карчэўскі**, — замест яго можна зрабіць... другі „Дзень мужчын"!

— А якая прадстаўніца прыгожага полу з'яўляецца тваім ідэалам?

— Вядома, прыгожая.

Мацек, як і ўсе яго класныя сябры — класік-кансерватар:

— Дзяўчына павінна ўмець гатаваць стравы і прыбіраць. Не павінна глядзець бразільскія тэлесерыялы.

Аляксандр Ваўранюк: — Такое штосьці, як „Свята жанчын", непатрэбнае — хопіць „Валянцінак".

Марыюш Врублеўскі: — Думаю, што „Свята жанчын" непатрэбнае, ёсць ужо „Валянцінкі".

Алекс Мазурук: — Мой ідэал? Няма такой дзяўчыны ў свеце! І навошта такое свята!

Ці патрэбны „Дзень мужчын"?

Гавораць дзяўчаты з пятага і шостага класаў — сябоўкі вышэйапытаных хлопцаў.

Эмілька Мусько: — Дзяўчаты найважнейшыя! А калі хлопцы думаюць інакш, няхай пашукаюць свайго свята ў календары?! Мой ідэал хлопца? Хлопцы павіны быць ветлівыя і добрыя для ўсіх.

Оля Паўлючук: — Які сябра найлепшы? Дасціпны, вясёлы, адказны, шчыры. Дзень хлопца, пакуль што, не такі папулярны, яго не адзначаюць у календары і мала хто пра гэтае свята ведае ды яго святкуе.

Наталля Кандрацюк-Свярубская: — Я ніколі не думала святкаваць „Дзень хлопца", але як трэба — то трэба. Хлопцы павіны быць, перш за ўсё, добрымі сябрамі, не спісваць на ўроках і не падлізвацца настаўнікам. Найлепш, калі яны сімпатычныя, прыгожыя і прыстойныя. Праўда, я не ведаю ці ўвогуле такія хлопцы бываюць! Ну, бо калі і ёсць прыгожыя, дык часта дурныя. Ці патрэбнае нам „Свята хлопца"? Як ёсць — хай сабе будзе! У нашай школе яго не ўспрымаюць сур'ёзна, яно хіба камуністычнае?

Оля Каліна: — Я доўга шукала „Свята мужчын" у польскім календары і яго не знайшла. Мой ідэал хлопца — каб не быў дурны, але ці такія ёсць на свеце?

Оля Максімюк: — Сябра павінен быць прыгожы і разумны — тады прыемна на яго глядзець і яго слухаць. Кепска, калі хлопцы маюць свой дзень і ніхто пра гэта не памятае. Я, напрыклад, сёння, першы раз пачула пра дзень хлопца.

Кася Юшчук: — Хлопец павінен быць моцны, прыгожы і шчыры.

Аня Яканюк: — „Дзень хлопца" патрэбны, бо тады мы, дзяўчаты, можам сказаць, якія яны важныя, і што іх любім.

Магда Саковіч: — Няма хлопцаў-ідэалаў, але найлепш, калі сябра прыгожы, не гаворыць дурніцы, не шкодзіць маёй рэпутацыі, калі ён адказны і калі ўвесь час не гаворыць мне пра камп'ютэр і футбол. Гэта нудотнае! Думаю, што „Свята мужчын" непатрэбнае. Гэта хлопцы павінны памятаць пра „Свята жанчын". Трэба заўсёды памятаць пра дзяўчат — не толькі ў гэты дзень!

Зорка

P.S. Аўтары найцікавейшых выказванняў выйгралі ўзнагароды — кашульку з мінулагодняга „Басовішча". Такая ж УЗНАГАРОДА чакае нашых чытачоў. Трэба адказаць на адно пытанне: **Калі, святкуем Дзень мужчыны? Адказы дашліце на працягу трох тыдняў (просім адзначыць ваш узрост).**

Наш спонсар: Беларускае аб'яднанне студэнтаў (БАС).

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Грае Караліна Буднік

Сяброўскі куточак

Добры дзень „Зорка"!

Мяне завуць Моніка Сямёнчык. Я жыву ў вёсцы Навасады. Вучуся ў пятым класе Пачатковай школы ў Дубінах.

У школе ў мяне шмат сяброў, але хачу таксама, пры дапамозе Вашай рэдакцыі, пазнаёміцца з вучнямі іншых школ. Мяне цікавіць музыка і міфалогія. Мой любімы гурт — „No Doubt".

Я хачу пазнаць сяброў, у якіх падобныя зацікаўленні. Буду рада, калі атрымаю ад іх лісты. Ахвотна адпішу.

Лісты просім пісаць у рэдакцыю „Нівы".

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На беларускім спектаклі ў Нарве

Зіма ці лета?

Калі сняжок сюды вернецца,
Лета ад нас адвернецца.
Зіма тут гаворыць першая:
— Я — найпрыгажэйшая.
А дзе краса лета?
А лета на гэта:
— Што ты кажаш, зіма халодная?
Я цёплае, а ты, зіма — лёдная.
Мяне дзеці кахаюць,
Пасля іх у школу вяртаюць,
Калі мне пара ўцякаць.
Чаго ім зімы чакаць!
А мы вясну, лета чакаем.
Зіму ад нас праганяем!
І вось на гэтым вершык канчаем.

Аксана Саснюк, VI „ц" кл. ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Дэкламавалі ў Нарве

Адборачны гмінны дэкламатарскі конкурс адбыўся ў Нарваўскім доме культуры. Гэтакі конкурс з агляду „Роднае слова" адбываецца толькі ў адной гміне, перад павятовымі адборамі, у якіх будуць змагацца непасрэдна пераможцы школьных элімінацый. А ў Нарваўскай школе адбыліся і класныя, у якіх прыняло ўдзел вельмі шмат вучняў, якія вывучаюць беларускую мову. Былі і дзеткі з ласінкаўскай школы, і з нарваўскай гімназіі. Аб высокім узроўні падрыхтовак і выступленняў сведчыць тое, што не ўсе добрыя дэкламатары змогуць паехаць на павятовы агляд, хоць таго вартыя.

У конкурсе выступіў 31 вучань у трох катэгорыях: вучні I-III, IV-VI класаў ды гімназісты. Бойка пачаў першы Тамаш Банькоўскі. За ім рушылі на сцэну Ася Іванюк, Аня Дамброўская, Мацвей Пшэздзех, Паўлік Асіпюк, Дзіма Дземідзюк, Юліта Кур'яновіч, Радзік Беразавец, Патрыцыя Лукашук... Першую ўзнагароду камісія рашыла даць у гэтай узроставай катэгорыі Дамініцы Юшкевіч, другую — Петрусю Грынявіцкаму, трэцюю — Дыяне Пашко. Дзеці самі выбралі творы, якія ім перш за ўсё спадабаліся, ужо вядомыя — пра балбатуху Мілу, Ягорку-прытворку, Мацея-грамацея што чытаў па складах, „беднага" Саўку, пра козачку, тэлефон, і пра тое, хто выпіў смятану... Дзіма расказаў літоўскую казку. Даўжэйшыя, больш сур'ёзныя вершы дэкламавалі вучні IV-VI класаў. Пачала выступленні ў гэтай групе вельмі ўдала Малгося Харкевіч тэкстам пра барсука і куніцу. Спраўна змагаліся з хваляваннем Аня Пашко, Эдыта Ляшчынская, Віялета Плашкевіч, Аня Порац, Хрыстафор Грынявіцкі, Лукаш Пляскавіч. А першымі сталі Агнешка Апольская (I), Ева Анапюк (II — нядаўна вывучае беларускую мову) і Агнешка Анікіюк (III). У групе гімназістаў можна было пачуць вядомых дэкламатарак, якія не першы раз змагаюцца за красу роднае мовы — Аню Іванюк, Магду Дудзіч, Моніку Банькоўскую, Асю Стоцкую, Юстыну Пашко, Мірку Ахрымюк... Дзяўчаты выбралі творы таксама і аўтараў-„белавежцаў" — Юрыя Баены, Віктара Шведа, Міхася Шаховіча. Перамагла Аліцыя Міранчук перад Маргарытай Кананюк (II) і Аняй Дудзіч.

(лук)

Польска-беларуская крыжаванка № 11

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 7: Лебедзь, гусак, спявак, корак, дар, сад. Гуска, спор, ваяр, квас, ака, сук.

Узнагароды — **папкі для запісаў** — выйгралі: **Агнешка Ляўчук** і **Раксана Казлоўская** з Новага Корніна, **Эля Шарэйка**, **Паўліна Мацяюк**, **Паўліна Паскробка**, **Паўліна Данельчук** і **Бася Хіліманюк** з Дубін, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

Як дзед з бабкай пад дудку скакалі

(беларуская народная казка)

Жылі-былі дзед і бабка і быў у іх сын Янка. З самых малых гадоў ён вельмі любіў іграць на дудцы. Ды так ён прыгожа іграў, што калі сумную песню зайграе, то ўва ўсіх слёзы льюцца, а калі вясёлую — ніхто не можа на месцы ўстаяць, усе спяваюць, скачуць-танцуюць. Вырас Янка ўжо вялікі і гаворыць бацьку:

— Пайду зарабляць і ўсё дадому прынясу.

Развітаўся Янка і пайшоў у дарогу.

Прыйшоў у адну вёску, там работнікі непатрэбны. Затым прыходзіць у другую вёску. Адзін стары кажа, што пастух патрэбны:

— Але калі дрэнна работу зробіш, зарплаты не атрымаеш, — асцерагае гаспадар.

Янка згаджаецца.

Прыгоніць ён авечак дадому, палічыць дзед з бабай, усе ў статку. Так праходзіць адзін месяц, другі, трэці. У канцы і час зарплаты прыйшоў. Гаспадар кажа:

— Усё добра. Скажы толькі — як гэта робіш, што ніводнай авечкі ты не згубіў?

— Нічога не раблю, — адказвае Янка.

Задумаў гаспадар сам усё праверыць. Узяў свой авечы кажух, вывернуў на левы бок і надзеў на сябе. Залез у хлеў і сядзіць.

Узышло сонца. Янка падняўся і пагнаў авечак на папас. Разбегліся авечкі па пашы, а гаспадару цяжкавата рухацца, але ўсё роўна бяжыць, не адстае. А сам у той час думае — як той сакрэт пастуха раскрыць і ад зарплаты выкрунуцца.

Янка заўважыў хітрасць гаспадара, гоніць авечак і ўсё стараецца, каб пугай папасці ў старога, за ашуканства. Прыгнаў пастух авечак, стаў на ўскраіне лесу і пачаў іграць на дудачцы. Авечкі ў скок! І гаспадар не можа на месцы ўстаяць. Скакаў, скакаў стары, аж з ног збіўся. І просіць-умаляе:

— Пакінь хлопча іграць, а то памру ад тваіх гукаў.

— А вы тут адкуль? — прыкінуўся здзіўленым пастух.

— Я... я... таго...

Прыйшоў стары дахаты і кажа бабцы, што трэба ўсю плату пастуху аддаць. Расказаў як ён сам быў вымушаны пад дудку скакаць. Жонка галавой пакруціла.

— Як і я пачну скакаць, — сказала, — то тады заплацім.

Дзед папрасіў, каб яго ў куфэрку да столі падчапілі.

Прыйшоў Янка, іграе.

Старая бабка пайшла ў скокі і дзед не змог выседзець у куфры, ён абарваўся ды бразнуўся аб памост, выскачыў са скрыні і на хаду кінуўся скакаць-танцаваць.

Але заплаціць пастушку не хочуць.

Тады Янка выйшаў на вуліцу і ўсё на дудцы іграе. Бабка з дзедам услед музыканту бягуць-скачуць. За імі авечкі бягуць-танцуюць. Людзі глядзяць, смяюцца.

— Спыні сваю дудачку, — просяць дзед з бабкай, — аддамо табе зарплату, аддамо.

— Як так, — сказаў пастушок, — давайце мае грошы.

Не было выхаду, дзед з бабкай па справядлівасці расплаціліся.

А Янка схаваў сваю дудачку і вярнуўся з прыбыткам да сваёй хаты.

Апрацоўка Ганны Кандрацюк

Ева Багроўская чытае беларускую прэсу і падрыхтоўку да конкурсу па роднай мове лічыць абавязкам...

Праверка ведаў і ўмеласцей

— Узровень конкурсу быў высокі, аб чым сведчыць колькасць вучняў, якія перайшлі да ваяводскіх элімінацый. Амаль усе ўдзельнікі набралі больш за 50% балаў, — паінфармаваў пасля праверкі работ старшыня конкурснай камісіі, настаўнік беларускай мовы Гайнаўскай белгімназіі Ян Карчэўскі. — У пісьмовых работах правяралі мы веды і ўмеласці вучняў. Найцяжэй было ім справіцца з практыкаваннямі на лічэбніках і перакладам з беларускай мовы на польскую. У некаторых былі праблемы з даканчэннем беларускіх народных прыказак і называннем зімовых святаў.

Да раённых элімінацый Конкурсу беларускай мовы, які нядаўна адбыўся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыступілі 86 вучняў з 11 гімназій Гайнаўскага, Бельскага і Беластоцкага паветаў.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Спачатку пытанні аказаліся цяжкімі (справа настаўніца Ніна Абрамюк)

Перад конкурсам вучні хваляваліся, хаця некаторыя з усмешкай на твары стараліся не паказваць гэтага. З конкурсу гімназісты выходзілі з палёгкай. Многія заяўлялі, што задачы ім падыходзілі. Настаўнікі больш асцярожна ацанілі конкурсныя пытанні, таму што вучні маглі няправільна выканаць некаторыя задачы.

— Я хацеў спраўдзіць ці сумею правільна адказаць на конкурсныя пытанні. Люблю беларускую мову, цікавяць мяне беларускія справы. Хацелася б, каб у чарговым этапе былі літаратурныя тэмы, — сказаў Адам Гуральчук, гімназіст з Дубіч-Царкоўных. Яго школьная сяброўка Ева Багроўская дабавіла, што самым цяжкім пытаннем было пералічэнне зімовых святаў. Рада яна задачам па граматыцы, бо да іх рыхтавалася. Чытае яна беларускую прэсу і падрыхтоўку да конкурсу па роднай мове лічыць абавязкам.

— Цяжкаваты быў конкурс, але я неяк сумеў адказаць на пытанні. Цікава ведаць, як мая праца атрымаецца на фоне іншых работ, — заявіў Андрэй Грыгарук з Гайнаўкі. Яго сяброўкі Наталля Тарасевіч і Дарота Куптэль сказалі, што граматыцы трэба вучыцца не толькі дзеля конкурсаў. На ўроках беларускай мовы любяць яны чытаць і спяваць.

Калі конкурсная камісія пачала правяраць работы вучняў, засталіся толькі гімназісты з Бельска-Падляшскага.

— На конкурсе было ўсё тое, на што звярталі нам увагу настаўнікі ў час падрыхтоўкі і таму нам паказаўся ён лёгкім. Я люблю пісаць літаратурныя працы і пераліваць свае думкі на паперу. Пішу вершы і таму аддаю перавагу пытанням па літаратуры, — заявіла Кацярына Краўчук з Бельска. Яе сяброўка Наталля Бабулевіч таксама больш любіць літаратуру, чым граматыку і многа чытае. Найцяжэй ёй даваліся лічэбнікі.

На ваяводскія элімінацыі камісія адабрала 20 гімназістаў. Сярод іх найбольш балаў набралі вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім (Івона Маркевіч — 101 бал; Адрыян Федарук і Марта Федарук — па 97 балаў; Анна Алясюк — 94 балы). Чарговые месца занялі Аліцыя Міранчук з Нарвы, Андрэй Грыгарук і Наталля Тарасевіч з Гайнаўкі і Аркадзь Дораш з Бельска. Усе апошнія вучні набралі па 93 балы.

Аляксей Мароз

Погляды на іншыя народы

За намовай д-р Ірэны Матус я вырашыла папытаць людзей з роднай вёскі, што думаюць пра іншыя нацыянальнасці, як успрымаюць чужаземцаў і якія ў іх погляды на іншых людзей.

Вёска па сваёй натуры — герметычная, а блізкі ёй свет абмежаваны да бліжэйшага наваколля: базара, царквы, магазіна, суседскіх сустрэч на лавачцы. Людзі, якія жывуць у такім свеце, часта маюць цікавыя погляды на жыхароў другой вёскі і чужынцаў, інакш успрымаюць іншыя нацыянальнасці, веравызнанні і адносіны тыпу свой — тутэйшы — чужы.

Католікаў, акрамя названня палякамі, вяскоўцы называлі катамі, дрэннымі людзьмі, якія не любяць праваслаўных, перашкаджаюць ім і не дапускаюць іх да голасу. Дабаўлялі яшчэ, што ў Польшчы пераважная большасць католікаў і яны не любяць нацыянальных меншасцей.

У сваю чаргу сябе лічаць кацапамі, праваслаўнымі, рускімі, сваякамі, тутэйшымі. Чаму кацапы, ніхто не мог мне растлумачыць. Гаварылі, што католікі так называлі праваслаўных з дзеда прадзеда. А рускія таму, што Расія і вера ў ёй праваслаўная.

Людзі не бачылі розніцы паміж беларусам і рускім, успамінаючы Савецкі Саюз. Вядома, што праваслаўныя, няма розніцы ці ён беларус ці рускі; мова не адыгрывала значэння, калі ішло пра нацыянальнасць.

Цікавае названне атрымалі ўкраінцы. Адны гаварылі хахлы, іншыя — сэкачы і матаны. Хахлы ад таго, што існуе такая дзяржава (Хахлы), у якой карыстаюцца хахлацкай мовай, але якая гэта мова людзі не ведалі. Сэкачы ад таго, што гавораць інакш, іншай мовай, моцна працягваючы гукі. Матанамі называюць таму, што адзяваюцца не так, як свае, не як тутэйшыя. У нас ходзяць у шапачках, а іхнія жанчыны носяць хусткі матанскія і па-іншаму апранаюцца.

Амаль усе людзі цыганоў называлі зладзеямі, вылучаючы тых, што кралі ў сваім асяроддзі і тых, што кралі ў чужой вёсцы. Цыганы жылі ў будах, у якіх ездзілі па вёсках. У лясах распальвалі вогнішчы, старыя цыганы кралі коней і малых дзяцей. Цыганкі варажылі і кралі па хатах усё, што было пад рукой. Цыганкі мелі сваіх мужоў у пашане, таму самыя хадзілі красці, а цыганы хадзілі абсыпаныя золатам і з пярсцёнкамі на пальцах.

Дваякія погляды былі на яўрэяў. Яўрэі былі бедныя як голыя сабакі, прадавалі булачкі і так зараблялі; ашчадныя і скупыя. З другога боку — толькі яны мелі грошы, магазіны, былі багатыя і прадавалі свае тавары па вёсках. Не зусім сумленныя яўрэйкі-прадаўшчыцы абманвалі дзяцей, прадаючы ім менш цукеркаў; яўрэйкі выходзілі замуж за праваслаўных і іх вучылі гандляваць і таргаваць. У яўрэяў можна было купіць усё.

Пра татараў ці мусульманаў людзі гаварылі, што яны зусім ім чужыя, іншая, незразумелая мова, іншыя традыцыі, культура, чужая вера. Яны маюць „сюсякі абрэзаныя" і не змагаюцца: народ, які любіць спакой, многа моліцца, не ўжываюць пісталетаў і не б'юцца.

Амерыканцы — людзі багатыя, „дбаюць, то і маюць", а палякі — гэта гультаі. Амерыканцы — людзі мудрыя, разумныя, таму багатыя. Успрымаюць сябе вельмі разумнымі і хочуць уладарыць светам. Амерыка ўсіх заваёўвае, а сама бароніцца і доўгія стагоддзі была не кранутая.

Жыхары Еўропы, паводле старэйшых людзей, хочуць аб'яднацца ў Еўрапейскі Саюз, дзе не ўсе багатыя, і бедных многа. Яны чужыя, хаця Польшча ляжыць у Еўропе.

Анна Садоўская

Успаміны N. N. з Чараўкоў.

Вогненнае памежжа

Час актывістаў (4)

(заканчэнне; пачатак у 8 н-ры)

У Савецкі Саюз выехала ад нас мала людзей, хаця былі агітатары. Калі мост у Страблі адбудоўвалі, у Чараўках стаяла рота савецкіх сапёраў; у нашай хаце кватаравалася іх дзесяць чалавек. Гаварылі яны пра агітатараў: „Эх ты, крыса тыловая: почему ты не идёшь на передовую? Вы его не слушайте!"

А нам салдаты сказалі: „Хозяин, ты не слушай их, никуда не выезжай! Есть хлеб и до хлеба — сиди, но не болтай. Там тебя никто встречать не будет".

З Чараўкоў выехалі чатыры сям'і, і з Кажан чатыры. Зажылі там гора. Выехаў мамін дзядзька і ўжо радзімы не мог наведаць. Колькі ён не прасіў, нават ліст самому Хрушчову пісаў, не пусцілі яго ў Польшчу. Толькі ў 1956 годзе сын яго прыехаў. Глядзеў у акно, ці хто не падслухоўвае і казаў: „У русских людей два смертельные врага: это колхоз и партия".

Дзедаў брат напісаў нам (нейкім цудам яго ліст прапусцілі): „Политика Советского Союза стоит на лжи и обмане". І яшчэ пісаў: „Ты пришли мне адресс Куприянюка. Но если он член партии — не хочу его знать".

У 1949 годзе сталі ездзіць у Чараўкі працаўнікі Павятовага камітэта намаўляць у калгас. Сходы доўжыліся па цэлых ночах. І ўсе члены партыі, дзесяць чалавек, запісаліся ў калгас у Чараўках і Кажанах. А пасля такі ціск зрабілі, што ў 1952 годзе і дзесяць сераднякоў запісалася ў калгас. Зааралі межы, а тых што ў калгас не хацелі, выганялі на горшую зямлю. Спачатку нічога не было, пасля пабудавалі абору, стадолу, склад, дзве хлеўні. Спярша абраблялі зямлю простымі прыладамі, пасля „Зэтар" з ГОМ у Рынках прыязджаў араць, пасля і машыны з ПОМ у Беласточку прыязджалі.

Спачатку ўраджай быў добры, а пасля ўсё горшы і горшы. Некаторыя не хацелі працаваць і ў 1956 годзе калгас у Чараўках, першы ў павеце, разваліўся. Разваліліся і калгасы ў Канцавізне, Завыках-Ферме, Заячках. У Завыках, Лешні і Дакторцах калгасы не арганізаваліся. У каталіцкія вёскі Рынкі, Срэдзінскія і Зімнохі прыязджалі агітатары, але нікога заагітаваць ім не ўдалося. Не арганізавалі калгасаў і ў Войшках, Рыбалах, Паўлах. Былі калгасы ў Плютычах, Райску, Дэнісках, Храбалах, Гацьках, Арэхвічах. Калгас у Дарожках вытрываў і сёння мае вялікі комплекс хлеўняў у Дарожках, Заячках ды Чараўках і з'яўляецца адным з большых пастаўшчыкоў мяса ў Беласток.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Нам не трэба было б будаваць храм, калі б не пазнімалі купалаў з храма па вуліцы Кавалерыйскай...

Маем багатую гісторыю

У лютым найбольш вядомы ў нас праваслаўны прапаведнік а. РЫГОР МІСІЮК з Падрэчан, Чыжоўскага прыхода, настаяцель прыхода св. Юрыя ў Беластоку, адзначаў саракагоддзе свяшчэнства...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

— Нядаўна адзначылі Вы выдатны юбілей — сорак гадоў пастырскай службы. Сорак гадоў — гэта важны старазапаветны тэрмін: столькі часу Майсей вёў свой народ у Ханаан, па столькі ж часу царылі Давід і Саламон. Саламон пабудаваў храм у Іерусаліме...

— Ён быў вельмі мудрым царом.

— Я ж не папракаю Вас, бо і за Вамі не пустое месца. Сам будынак Вашага храма ўзведзены да паловы. Як Вы бачыце яго далей: ці выразныя абрысы, ці туманныя?

— Ніжнюю частку я ўяўляю — план ёсць. Калі накрыем верх, тады зробім штукатурку ніжняга. Ужо знізу шмат што зроблена: асновы супрацьузломнага, супрацьпажарнага, гукаперадатачнага і электрычнага абсталявання, прывод да абагравальнай гарадской сеці. Калі пакладзем тынк, станем там служыць, каб людзі адчулі канкрэт ад ахвяраванняў.

— Выбачайце мне за туманнае пытанне, але я меў на ўвазе канкрэтнае распісанне пабудовы ў часе.

— Цяжка прадбачыць магчымасці вернікаў. Мы не атрымліваем вонкавай падтрымкі ні ад горада, ні ад дзяржавы. Складана нават на сёлетні год планаваць. У мінулым годзе прадалі мы кватэру і гэта дапамагло нам фінансаваць пабудову.

— Пяць гадоў таму ў Беластоку ладзіліся ўрачыстасці чвэрцьтысячагоддзя горада. Тое мерапрыемства праскандалілася адхіленнем праваслаўных ад удзелу ў ім, быццам праваслаўе не мела дачынення да гісторыі горада. Ці не складваецца ў Вас уражанне, што Вам можна паставіць закід — гаворачы на адным з праваслаўных дыялектаў — празелітызму на чужой кананічнай тэрыторыі?

— У Беластоку шмат зроблена за мінулыя гады, каб сляды праваслаўя былі знікомыя. У час адной канферэнцыі беластоцкія светачы навукі заходняй арыентацыі вялікі націск клалі на дату нараджэння Прасвятой Дзевы Марыі. Усе іх высновы зводзіліся на 8 верасня. І яны моцна збянтэжыліся, калі я заўважыў, што адбылося гэта тады, калі грыгарыянскага календара яшчэ не было, толькі юльянскі і 8 верасня паводле юльянскага, гэта сённяшняе 21 паводле новага стылю.

Дарэчы, ёсць больш відавочных фактаў нашай прысутнасці ў гісторыі горада. Нам не трэба было б будаваць храм, калі б не пазнімалі купалаў з храма па вуліцы Кавалерыйскай. Не трэба было б будаваць Агія Сафію, калі б таго ж не зрабілі з храмам па вуліцы Траўгута. Гэтак жа было з храмам св.св. Кірылы і Мяфодзія ў Старасельцах, а пажылыя беластачане памятаюць як разбіралі Уваскрэсенскі храм па вуліцы Сянкевіча. Калі б мы не сведчылі словам і чынам пра сваю гісторыю, тады напэўна абвінавацілі б нас у празелітызме. Пакуль мы будзем памятаць і сведчыць, што мы на сваім і ветліва адносімся да тых, што прыехалі да нас у гасціну, тады ўсё будзе нармальна.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Мне было дадзена ў 1985 годзе рыхтаваць 900-годдзе прыхода ў Драгічыне; тады яшчэ не было поўнасцю адменена ваеннае становішча. Прыехала некалькі тысяч людзей, у іх ліку і замежныя госці з мітрапалітам Мінскім і Беларускім Філарэтам. Тады не было ў нас магчымасцей гаварыць пра гэта ні ў радыё, ні ў тэлебачанні, ні пісаць у газетах. Але паколькі было гэта напярэдадні свята на Святой Гары Грабарцы, заўважылі гэта журналісты з агульнапольскіх тыднёвікаў і такім чынам уся Польшча даведалася, што праваслаўныя ў нашай краіне, гэта не вынік падзелаў Польшчы, а Царква наша мае раўнапраўную, а нават старэйшую гісторыю за Касцёл.

Мала каму з жыхароў Польшчы вядома, што 1863 год быў аб'яўлены папам рымскім Піем IX годам 1000-годдзя хрысціянства ў Польшчы (у 863 годзе місія братоў Кірылы і Мяфодзія ды іх вучняў закранула Польшчу). Не было толькі святкаванняў, бо пачалося Студзеньскае паўстанне, але лісты ў касцёлах аб 1000-годдзі хрысціянства былі зачытаны.

— Калі я наглядаю за Вашай, асабліва журналісцкай, дзейнасцю, у мяне складваецца ўражанне, што Вы атрымалі рэлятыўна надзвычайны дар Святога Духа.

— Без гэтага дарунку Святога Духа не было б святароў. Кожны з нас па меры сваіх магчымасцей і здольнасцей гэтым дарам карыстаецца, а дары Святога Духа вельмі розныя.

Хвалююся, што позна ўзяўся за пабудову, бо ў маім узросце мала хто на гэта наважваецца. І малю Бога, каб дачакаць маліцца ў ніжнім і верхнім храме, каб намаліць сцены.

Наша царква будуецца на скрыжаванні дарог, сімвалічна, як на скрыжаванні тысячагоддзяў. Каб тыя, хто будзе хадзіць у яе, той сімвал апраўдалі.

— Дзякую за размову і жадаю поспехаў у вашай грандыёзнай працы.

Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі

Усе фоткі www.vikingsonline.org.uk

Нарманы ў гісторыі Беларусі

VI частка

Сагі былі спісаны даволі позна, тым не менш, паданні мусілі існаваць раней. Якраз у час, калі пісалася „ніканаўская" частка *Повести временных лет*, нармандзец Гійом Байструк заваяваў Англію і стаў Уільямам Заваёўнікам. Пра яго род пэўне ж загаварылі па ўсёй Еўропе. Польскі флот паплыў нават у Англію, каб памагчы датчанам адваёўваць гэту краіну ад нармандцаў. Польскім каралём быў у той час Баляслаў Смелы, пераможца Усяслава ў змаганні за Кіеў. Датчане і палякі з дапамогай англійскіх паўстанцаў узялі Йорк (Ёрвік), але ў выніку нерашучасці дацкага караля Свена мусілі ўступіць з Англіі. Дзе быў тады Усяслаў са сваім флотам (бо ў яго безумоўна мусіў быць свой флот) — няма ведама. Пра пачаткі роду Вільгельма Заваёўніка расказвалі па-рознаму і розныя расказы дайшлі, відаць, над Дняпро. Імёны Рагвалода з-за мора, Рагнеды і Турага тутэйшыя летапісцы маглі пачуць з *Сагі пра аркнейцаў*, а памясціць іх над Дзвіною пад уплывам расказаў пра Рэгвіда з *Сагі пра Рольфа Пешахода*. Аўтар *Повести временных лет*, які словы *sine hus thru varing* зразумеў як „ з братамі Сінеусам і Труварам", таксама лёгка мог зрабіць Рагнвальда з Морэ Рагвалодам „изъ заморя". Замена жонкі дачкой, а сына братам пры тым неістотная дробязь. У выпадку *Повести временных лет* і яе адносін да нашай гісторыі безумоўна маем дачыненне не з гісторыяй як такой, толькі з літаратурна-ідэалагічным канструктам першых нарманістаў — яе стваральнікаў. Адзінае, што ўпэўнена можам пра іх сцвердзіць, дык тое, што не любілі яны нашых продкаў.

На жаль, адносна пачаткаў нашых дзеяў (цяжка мне падабраць іншае слова) мы практычна нічога не ведаем. Пішучы „гісторыю Беларусі" тых часоў, мы толькі выбіраем міф з ліку тых, якія былі створаны да нас, бо з гэтых асколкаў гісторыі, якія маем, стварыць нейкі новы міф, відаць, немагчыма.

Цяпер зноў модным робіцца нарманскі міф. Кніжка А. Катлярчука безумоўна спрычыніцца да пашырэння гэтага міфа. Міф міфам, усё-такі трэба ясна сказаць, што шведы тут ні пры чым. Усе нарманы, як гістарычныя, так і легендарныя, якіх можна звязваць з гісторыяй Беларусі — безумоўна нарвежцы. Аднаму шведу павязло праплыць Дзвіну і гэта было дастатковай прычынай, каб папасці ў адзіную шведскую сагу. Не ведаю чаму гэтыя шведы былі тады такія няўдалыя. Адзіны адказ, па сутнасці метафізічны, дае Леў Гумілёў. Паводле яго, касмічнае прамяняванне, якое выклікае

мутагенез і нараджэнне г.зв. пасіянарыяў, закранула ў VIII ст. толькі нарвежцаў і датчан. Шведам паводле Гумілёва нічога не дасталося.

Паколькі наш легендарны вараг Рагвалод быў нарвежцам, а іхні легендарны вараг Рурык — датчанінам, можна папоўніць нарманскі міф новай тэорыяй адносна паходжання назвы «Белая Русь». Ірландцы ў той час называлі нарвежцаў «белымі чужынцамі» (Finn-Gaill), а датчан — «чорнымі чужынцамі» (Dubh-Gaill). Паколькі першая згадка пра «Белую Русь» знойдзена ў Ірландыі, у г.зв. *Дублінскім рукапісе*, няцяжка ўявіць сабе, што «белая русь» гэта «белыя варагі», значыць нарвежцы.

Каму даспадобы, няхай верыць. Я, маючы выбар між чужым і сваім, выбіраю сваё. Адзіны ўласнабеларускі гістарычны міф — гэта крывічанства, бо крывіцкі міф расказаны выключна тубыльцамі: Нарушэвічам, Кулакоўскім і Ластоўскім. Дарэчы, калі кіеўскія летапісцы проста запісваюць падзеі, а не пішуць „гісторыю", наша праўда выходзіць як шыла з мяшка: полацкія князі называюцца князі крывіцкія. Іншых у нас не было.

(канец)

Алег Латышонак

PS. Я не змог бы напісаць гэтага артыкула без сяброўскай дапамогі Алеся Белага, які падзяліўся са мною сабранымі сабою матэрыяламі адносна гісторыі нарманаў. Вялікі яму дзякуй. **А. Л.**

Беларусы ў Амерыцы не пераўтварыліся ў істоты без роду і племені...

baza-belarus.org

Як вядома, лёс у кожнага чалавека свой. І хоць здаецца, што нешта напачатку плануеш, потым аказваецца, што жыццё ўсё перайначыла па-свойму. Усё як у той прымаўцы — чалавек мяркуе, а Гасподзь размяркоўвае. Так калісьці адбылося з беларусамі, якія найчасцей не з уласнай волі апынуліся далёка ад роднай зямлі. І нават не проста далёка, а на другім баку свету, у Амерыцы. Але не пераўтварыліся яны ў істоты без роду і племені, а захавалі сваю нацыянальную адметнасць. І, што больш важна, здолелі, як і многія іншыя эмігранты, аб'яднацца і стварыць арганізацыю — Беларуска-Амерыканскае Задзіночаньне, альбо коратка БАЗА.

Менавіта БАЗА дзейнічае даволі актыўна на карысць агульнабеларускай справы там, за акіянам. Пераканацца ў гэтым можна зазірнуўшы на яе сайт http://baza-belarus.org.

Перад карыстальнікам Інтэрнэту гэтым разам адкрыецца блакітна-бэжавае выяўленне, уверсе якога здымак людзей, што ідуць пад бел-чырвона-белымі сцягамі. Адпаведны надпіс-назва стварыўшай сайт арганізацыі выкананы на дзвюх мовах — беларускай і англійскай. Трэба адзначыць, што двухмоўнасць пранізвае наскрозь усю віртуальную старонку, часамі перахлынваючы англійскімі тэрмінамі на беларускамоўны варыянт. Для ведаючых самую распаўсюджаную ў свеце мову гэта, зразумела, не перашкода, але для значнай часткі простых беларускіх карыстальнікаў Інтэрнэту такая акалічнасць, відавочна, створыць пэўныя цяжкасці.

Пад назвай сайта размешчаны некаторыя раздзелы, якія, відаць, на думку распрацоўшчыкаў, маглі б выклікаць найбольшае зацікаўленне. І сапраўды, для цалкавітага знаёмства з арганізацыяй варта зазірнуць у раздзел „Хто мы?" Менавіта тут можна лёгка знайсці адказ на пытанне: хто і з якой мэтай аб'яднаўся ў БАЗА і стварыў цікавы па змесце сайт.

Варта адразу адзначыць, што сайт не навінны і таму асноўны ўпор у яго напаўненні зроблены на паведамленні апісальнага характару. Хаця ўсе паведамленні падаюцца ў храналагічным парадку, бачна, што дзеячы БАЗА больш канцэнтруюцца не на хуткім абнаўленні свайго Інтэрнэт-партала, а на нейкай іншай, відаць, больш важнай працы. Але тым не менш цікава пракруціць ад пачатку да канца ўсю галоўную старонку, каб паглядзець, чым жывуць беларусы ў Амерыцы, якія падзеі з жыцця лічаць найбольш вартымі для асвятлення. Тут, між іншым, можна віртуальна пагартаць старонкі газеты „Беларус", якая аддаўна выходзіць у Новым Свеце. Праўда, асабліва засядзецца над артыкуламі не ўдасца — у архіве знаходзіцца толькі сем леташніх нумароў.

Рубрыка „Раздзелы" дае карыстальніку магчымасць засяродзіць увагу менавіта на тым раздзеле сайта, які ён палічыць найбольш для сябе цікавым. А сярод іх: „Аб'явы", „Навіны", „Весткі і паведамленні", „Кнігарня", „Асобы" і „Дыярыюш". Назвы гавораць самі за сябе, а пра два апошнія раздзелы зазначу, што змяшчаюць яны ў сабе публіцыстычныя артыкулы і нататкі на розныя тэмы палітычнага і культурнага жыцця.

Правы бок сайта таксама дае магчымасць адразу выйсці на тую рубрыку, якая выклікае найбольшы інтарэс. Тут дыяпазон значна шырэйшы, чым уверсе. Карыстальнік можа прыняць удзел у галасаванні па прапанаваных пытаннях, праглядзець архіў сайта, фотаздымкі з розных акцый, даслаць свой уласны артыкул, напісаць электроннае паведамленне. Таксама можна прыняць удзел у абмеркаванні чаго-небудзь на „Форуме", праўда, для такога дзеяння трэба напачатку зарэгістравацца (як гэта зрабіць тлумачыцца крыху ніжэй), стаўшы са звычайнага госця падпісчыкам з усімі выцякаючымі з гэтага плюсамі. Праўда, каб рэзультатыўна зарэгістравацца, спатрэбіцца неблагое веданне англійскай мовы. І таму адсутнасць гэтага ведання можа стварыць пэўныя праблемы.

Левы бок сайта ў многім дублюе тое, што было змешчана на папярэдніх частках. Але гэта перашкоды не стварае, а хутчэй аблягчае работу з віртуальнай старонкай жыцця заакіянскіх беларусаў

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

Пад знакам байкоту
(1980, Масква, 36 медалёў)

Аніводныя алімпійскія гульні нашага часу не былі так палітызаваныя. Трэба адзначыць, што вартасць маскоўскіх медалёў стала ў значнай ступені дэвальваванай. Байкатавалі форум ЗША і ФРГ, якія на папярэдняй алімпіядзе былі ў квартэце мацнейшых, не прыехалі моцныя атлеты з некаторых іншых краін. Па-сутнасці спаборніцтвы можна было назваць „Адкрыты кубак сацыялістычнага лагеру". У такой сітуацыі шанцы беларусаў значна павысіліся. Калі б Беларусь у Маскве выступала незалежнай краінай, то мела б 11-е выніковае месца. Усяго нашы суайчыннікі здабылі 36 медалёў (яны на рахунку адразу 28 чалавек у 16 відах спорту. Пералічым усіх лаўрэатаў 1980-га. Найбольшы поспех выпаў на долю весляра ***Уладзіміра Парфяновіча*** *— тры золаты (на байдарцы адзіночцы — дыстанцыя 500 м. і на байдарцы-двойцы — дыстанцыі 500 і 1 000 м. Па два першыя месцы занялі гімнастка* ***Нэлі Кім*** *(у камандным першынстве і вольных практыкаваннях) і плывец* ***Сяргей Каплякоў*** *(на дыстанцыі 200 м і ў эстафеце 4 па 200 м, ён заваяваў яшчэ срэбра ў эстафеце 4 па 400 м). Чэмпіёнамі гульняў таксама сталі: баскетбалістка* ***Тацяна Івінская*** *(у складзе дружыны СССР), веласіпедыст* ***Алег Логвін*** *(камандавая гонка на 100-кіламетравай шашы), вяслярка* ***Алена Хлопцава****, коннік* ***Віктар Угрумаў*** *(на яго балансе таксама бронза), скакун у ваду* ***Аляксандр Партноў*** *(на трохметровым трампліне), штангіст* ***Леанід Тараненка*** *(у найбольш прэстыжнай суперцяжкай вагавай катэгорыі), фехтавальнікі* ***Мікалай Алёхін*** *і* ***Віктар Сідзяк****. Срэбныя медалі здабылі барэц грэцка-рымскага стылю* ***Ігар Каныгін*** *(катэгорыя да 90 кг), гандбаліст* ***Аляксандр Каршакевіч****, хадок* ***Пётр Пачанчук*** *(дыстанцыя 20 км), плыўчыха* ***Эльвіра Васількова*** *(у яе яшчэ бронза), скакун у ваду* ***Уладзімір Алейнік****, стралок-лучнік* ***Барыс Ісачанка****, фехтавальнікі* ***Алена Бялова****,* ***Аляксандр Раманькоў*** *(плюс бронза),* ***Уладзімір Лапіцкі*** *і* ***Ірына Ушакова****. Бронзавымі медалямі былі ўганараваны футбаліст* ***Аляксандр Пракапенка****, весляры* ***Ігар Майстрэнка****,* ***Андрэй Лугін****,* ***Антаніна Мельнікава****, лёгкаатлеты* ***Яўген Іўчанка*** *і* ***Мікалай Кіраў****, стралок* ***Аляксандр Газаў****.*

Нэлі Кім, якая нарадзілася ў Таджыкістане, вучылася ў Казахстане, усё дарослае жыццё звязала з Беларуссю. У 1976 годзе ў Манрэалі яна ўзяла 3 медалі, у Маскве — 2. Усяго — 5 узнагарод. Пазней працавала дзяржтрэнерам, міжнароднай суддзёй, стала віцэ-прэзідэнтам Беларускай асацыяцыі гімнастыкі.

Алена Бялова ўвайшла ў эліту чацвёртую запар алімпіяду. Аўтарытэт здабываецца ўсё жыццё, а траціцца за адну хвіліну. Так здарылася і са знакамітай фехтавальніцай. Пасля заняткаў спорту яна паспяхова ішла па прыступках чыноўніцкіх кабінетаў. Скандал здарыўся напярэдадні алімпіяды ў Атланце ў 1996 г. Бялова, як функцыянерка Нацыянальнага алімпійскага камітэта цягнула лёсы, каб вызначыць пераможцу сярод заўзятараў дзеля паездкі на алімпіяду ў ЗША. Бялова выцягнула картку з прозвішчам Оля Іванова. Выявілася, што дзяўчына — дачка вядомага ў Беларусі кампазітара Валерыя Іванова і ... Алены Бяловай. Махлярства знакамітай рапірысткі выкрылі адразу, тым больш, што ўся цырымонія здымалася на відэастужку. Пасля гэтай гісторыі Бялова надоўга знікла з тэлевізіі і старонак прэсы.

Яшчэ ганебней вызначыўся майстар выездкі на кані Угрумаў. Сваю трэнерскую кар'еру гэты „выхавацель" завяршыў датэрмінова — за сексуальныя дамаганні да сваіх вучаніц была нават распачата крымінальная справа.

Уладзімір Парфяновіч быў шматразовым чэмпіёнам свету і Еўропы, 17-разовым пераможцам першынстваў Савецкага Саюза. Пасля сканчэння выступаў нейкі час трэніраваў, потым усё актыўней займаўся грамадска-палітычнай дзейнасцю, стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. Сёння адзін з вядомых беларускіх палітыкаў, уваходзіць у парламенцкую апазіцыйную групу „Рэспубліка".

Жыццё некаторых алімпійцаў склалася трагічна. На пачатку снежня 1991 гродзенца па жыхарству (ураджэнца вёскі Ляхаўцы на Берасцейшчыне) Пятра Пачынчука знайшлі мёртвым у сваім гаражы. Афіцыйная (і найбольш верагодная) версія — самагубства на глебе асабістых праблем. Аляксандр Пракапенка быў адным з самых таленавітых футбалістаў Беларусі і нават Еўропы. Сам факт — трапіць у зборную СССР, дзе прыярытэт заўсёды аддаваўся маскоўцам, сведчыць пра многае. Пракапенка ў Беларусі быў сапраўды народным кумірам. Пік славы прыйшоўся на 1982 г., калі мінскае „Дынама" стала чэмпіёнам СССР. Тэхнічны і сціплы хаўбек, заставаўся ў цяні сваіх партнёраў на афіцыёзных прыёмах, але любіў выпіць у простай сяброўскай кампаніі. З гадамі звычка перайшла ў зацяжную хваробу. Недарэчная смерць напаткала Аляксандра Пракапенку ў адным з мінскіх рэстаранаў, дзе ён падавіўся шашлыком. Пахаваны геніяльны футбаліст у родным Бабруйску.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільманові

БАС выбіваецца з падполля

Цяжка гаварыць мне гэтыя словы, да таго яшчэ як былому кіраўніку БАС, але гэта праўда!!! Чарговы раз, калі прэзідэнтам беларускіх студэнтаў стала кабета, арганізацыя падымаецца з небыцця, грамадскай непашаны і фінансавага дна.

Год назад кіраўнічую пасаду атрымала Ілона Карпюк і ўжо амаль з самага пачатку аблічча арганізацыі пачало мяняцца. Старыя басаўцы або самі ўцяклі, або былі зняты. Новыя гурткі пачалі арганізавацца ў Варшаўскім і Беластоцкім раёне. Маладыя студэнты поўныя ахвоты дзеяць, пачалі працаваць над новымі праектамі пашырэння дзейнасці арганізацыі. Пачаліся новыя часы.

На пачатак „Басовішча 2003". Амаль адначасова ўсе сказалі — як прыемна, што гэты фестываль у канцы канцоў адбіўся ад дна. Нават самыя вялікія працаўнікі перасталі папракаць — кабету нельга крытыкаваць, нехта скажа! А вось няпраўда ў тым, што „Басовішча" было сапраўды добрае.

Нават славуты „рэйд Бацькаўшчына", які апошнімі гадамі жыў як і самая бацькаўшчына, пачаў праводзіцца пастаянна, штогод збіраючы ўсё больш вандруючых. Хто ж са студэнтаў не хацеў бы ісці ў рэйдзе, дзе ідуць студэнткі. А вось тут упэўненасць была, што студэнткі будуць. У найгоршым выпадку адна, але будзе — Ілона.

Чарговым, вельмі добрым водгукам было надта вялікае зацікаўленне „Басовішчам" і БАСам у агульнапольскіх СМІ. Усё, як здаецца, адбылося паводле дасканалага плана спадарыні прэзідэнт. Нехта скажа, што ў тэлепраграме „Ідал" сястра Ілоны выступала. — Ну, добра, — адкажу, але былыя кіраўнікі БАСу таксама маюць сясцёр і братоў, і гэтага фактара ў прамаванні арганізацыі не выкарысталі.

Здольнасці ў Ілоны Карпюк вялікія. Доказам таму апошняя падзея культурнага маштабу ў жыцці горада Беластока. 29 лютага ў кінатэатры „Форум" адбылася прэм'ера фільма „Osiemnaście" і мушу сказаць, што ніколі мне асабіста не ўдалося пачуць столькі пахвал наконт БАСу, „Басовішча" і самой Ілоны Карпюк. І ўсе тыя словы сказалі не абы-хто, толькі прадзюсер, рэжысёр і акцёры фільма. Фільм здымалі яны ў час фестывалю і, як даведаўся я ад маладой Улі Уцінскай (галоўная гераіня фільма) *na „Basowiszczu" było tak fajnie, że aż nie chciało mi się wyjeżdżać na dalsze zdjęcia.* Тады я зразумеў у чым слабая якасць актыўнасці і прадуктыўнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Як бачыце, гэтай залатой сярэдзінай з'яўляецца кабета на кіруючай пасадзе. Прыгадаю, што БАС першае адраджэнне перажываў у часы кіраўніцтва Барбары Пякарскай (тады Кучынскай).

Дарэчы, памятаю, што зусім нядаўна нашы кабеты збіраліся ствараць беларускі жаночы звяз у Польшчы. Чаму не ўдалося — не знаю. Зараз ёсць магчымасць здзейсніць гэтую ідэю. Я адразу аддаю сваю прыхільнасць і ахвоту ваяваць супраць антыжаночага лобі ў беларускім асяроддзі ў Польшчы. Жанчыны на кіраўнічыя пасады!!!

Татка Стэп

Вялес 2003

Прэмію Таварыства вольных літаратараў (ТВЛ) „Гліняны Вялес" за лепшую мастацкую кнігу 2003 года атрымае пісьменнік і літаратуразнавец Пятро Васючэнка за кнігу казак „Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі".

— Выбіралі лепшую кнігу года толькі „профі", — паведаміў старшыня ТВЛ Алесь Аркуш. — У якасці экспертаў у галасаванні паўдзельнічалі такія аўтарытэты як Валянцін Акудовіч, Сяргей Дубавец, Леанід Галубовіч, Уладзімер Сіўчыкаў ды іншыя знакамітасці. А ў фінале, пасля папярэдняга адбору, засталося тры прэтэндэнты: кніга прозы Сяргея Рублеўскага „Азярод", паэтычны зборнік Валянціны Аксак „Віно з Каліфорніі" і кніга казак Пятра Васючэнкі „Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі", якая ў выніку і перамагла...

Выдадзеная ў дзяржвыдавецтве „Мастацкая літаратура" ў другой палове 2003 года кніга Пятра Васючэнкі з'явілася ў кнігарнях толькі напрыканцы студзеня 2004 г. Але ўжо падчас агульнабеларускага лютаўскага кніжнага кірмашу ў Мінску яна была адзначана Дзяржаўнай кніжнай палатай Беларусі як „Лепшая беларуская кніга года". Адметна тое, што апошнім часам, ва ўмовах „ідэалагічнай цэнзуры", усё часцей прэміі здабываюць „апалітычныя" творы для дзяцей.

Ігар Гандлеўскі

ЮРЫСТ РАІЦЬ

Жыццё здзіўляе нас сваімі, часта непрыемнымі, сюрпрызамі, ствараючы сітуацыі аб якіх не падумаў бы ніхто, нават у жудасным сне. Найлепшы прыклад таму — сітуацыя, калі чалавеку на старасць няма дзе жыць, а шклянку вады падае незнаёмы, бо ад свайго дзіцяці, якому перададзена гаспадарка, атрымоўваюць толькі штурхалі і лаянку. Што рабіць у такім становішчы, як забяспечыць сабе спакойную старасць? — на такія і падобныя пытанні адказвае юрыст **Пятро Юшчук**.

— Ці часта спатыкаецеся з падобнымі праблемамі?

— Такіх спраў мноства. Людзі на старасць, каб спакойна пражыць апошнія гады, не думаючы, што пасля смерці дзеці і астатнія сямейнікі будуць сварыцца, а не дай Бог і судзіцца за кавалак зямлі ці старую хату, пераносяць права ўласнасці маёмасці на выбраную асобу. Тады вельмі часта аказваецца, што гэта памылковае рашэнне, бо роднае дзіця выганяе з хаты і на старасць няма дзе падзецца.

— Які выхад з такога становішча?

— Не пераносіць права ўласнасці да нерухомасці, або як гавораць „запісваць маёмасць" выбранай асобе яшчэ пры жыцці. Найлепшым выхадам з'яўляецца спісанне тастамента, бо толькі такая форма запісу абароніць спадчынадаўцу ад нечаканых праблемаў. Уладальнік тады не траціць права ўласнасці, якое з'яўляецца гарантам стабільнасці, а дорачы яшчэ пры жыцці адной або некалькім асобам трэба лічыцца, што могуць яны аказацца няўдзячнымі. Паводле законаў з хвілінай заключэння даравальнай дамовы ў форме натарыяльнага акта трацім парава на ўласнасць. Аднак такую праблему можна вырашыць толькі тады, калі ад устанаўлення даравання не мінулі яшчэ два гады, і падаць справу ў суд, даказваючы неадпаведныя паводзіны спадкаемца.

— Што рабіць, калі сумняваемся ў тым як будуць ставіцца дзеці пасля атрымання зямлі ў спадчыну?

— Найлепшы выхад — тастамент — асабістае распараджэнне. Бываюць тры формы тастамента. Першая — натарыяльны акт, заверанае натарыусам завяшчанне. Другая — завяшчанне з уласнаручным подпісам і датай яго саставлення з абавязковым загалоўкам „Тастамент", бо толькі тады будзе яно важнае (калі не будзе аднаго з тых элементаў, дакумент няважны). Трэцяя форма — пратакол спісаны ў прысутнасці войта, кіраўніка ЗАГС, або старшыні Рады гміны і двух сведкаў, з захаваннем завяшчальнай формы (з загалоўкам, подпісам, датай).

— Часам бываюць асаблівыя сітуацыі, напрыклад, калі чалавек неспадзявана захварэў і апынуўся на грані смерці, а тастамента не спісаў. Што рабіць тады?

— Такія сітуацыі здараюцца часта і польскія законы прадугледжваюць добрае вырашэнне такой праблемы. Спадчынадаўца распараджаецца сваёй воляй у прысутнасці трох сведкаў, якія саставляюць пры ім завяшчанне, пад якім усе падпісваюцца, спадчынадаўца таксама. Другая магчымасць — спісанне волі пасля смерці спадчынадаўцы з дакладным азначэннем часу спісання, выдачы, і выразнымі подпісамі спісваючых.

— Як самому напісаць тастамент, каб быў сапраўдным? Якія фармулёўкі павінны абавязкова апынуцца ў тастаменце?

— Гэта простая справа. На картцы паперы павінны знайсціся: загаловак, асабістае распараджэнне наконт лёсу сваёй маёмасці, подпіс і дата. Завяшчанне павінна быць напісанае ўручную і самастойна. Выглядае гэта больш-менш так: „Ja niżej podpisany Jan Kowalski powołuję do spadku mego syna Mikołaja Kowalskiego…..". Самым важным з'яўляецца прымяненне слова „powołuję", бо „запісваем" адну рэч, адзін прадмет, а да цэлай спадчыны „powołujemy".

— Хто мае права на маёмасць, калі чалавек памірае не пакінуўшы тастамента?

— Ёсць два кругі спадкаемцаў. Першы — гэта дзеці і муж або жонка, а другі — бацькі, браты, сёстры і муж або жонка, якія прымаюць у спадчыну не менш чым палову маёмасці, і гэта называем законнай спадчынай.

— Дзякую за парады!

Гутарыла Паўліна Шафран-Асташэвіч

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Маладому цырульніку з вопытам, тэл. 0606994639.

• Прыму на добрых умовах машыннага электрамеханіка, тэл. 676 05 88.

• Шукаю адказнай, працавітай жанчыны, якая добра зварыць, дакладна прыбярэ, запрапаную працу на добрых умовах, справа пільная, тэл. 0504 072 522.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Маладая, добрае веданне нямецкай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0508 753 167.

• Мужчына пільна шукае працу, III група, тэл. 0604 671 311.

• Сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, уласная машына, тэл. 0508 628 196.

• Маладая жанчына шукае працу ў Беластоку, музычная адукацыя, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0505 539 228.

• Ахвотна заапякуюся малым дзіцём, тэл. 0508 820 414.

• Жанчына (43 г.), тэхнічная адукацыя, закончаныя курсы камп'ютэрнага рахункаводства, права працы і экатурызм, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат часу, тэл. 730 40 00 (Бельск-Падляшскі).

• Вышэйшая эканамічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 661 38 78.

• Пекар, вопыт у гастраноміі, кніжка здароўя, санітарны мінімум, тэл. 722 08 80.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць) тэл. 0602 769 109.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, добрае веданне англійскай мовы, правы кат. В, уласная машына (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 651 36 96.

• Малады мужчына (26 г.), працоўны стаж у тэхнічным магазіне, санітарны мінімум, уласная машына, правы кат. В, тэл. 662 07 88.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692 687 442.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе пледаў, пасцелі і цёплага адзення для дзяцей (6, 9, 12 і 14 гадоў).

• Самотная маці з хворым сынам ва ўзросце 12 гадоў будзе ўдзячна за ўсякую помач пры закупе лякарстваў, галоўная патрэба — інвалідная каляска.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 і 13 гадоў.

• Сям'я з 4 дзяцей патрабуе пасцелі, цёплых ботаў для 6- і 9-гадовых хлопцаў і 13-гадовай дачкі.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і куртак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

• Старэйшае сужонства патрабуе асобы, якая бясплатна дапаможа ў хатніх працах.

• Шасціасабовая сям'я без сродкаў да жыцця патрабуе цёплага адзення і абутку для дзяцей, а таксама пасцелі, тэл. 730 20 06.

У Беластоку: 732 01 86; 712 11 53

• Сям'я будзе ўдзячная за адзенне для хлопчыкаў ва ўзросце 5 і 6 гадоў.

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка і старых куртак для хлопцаў 14- і 16-гадовага ўзросту.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, а таксама пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля), тэл. 712 11 53.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 651 80 20.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Беларускі каляндар

11 сакавіка

1887 — нар. Алесь Гарун.

1911 — нар. Леў Гарошка, уніяцкі рэлігійны дзеяч, гісторык, выдавец, пісьменнік.

1941 — загінуў Аляксандр Уласаў.

1990 — у Мінску была адслужана першая грэцка-каталіцкая літургія па-беларуску.

13 сакавіка

1890 — нар. Аляксандр Савіч, гісторык Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.

14 сакавіка

1943 — памёр Васіль Захарка, беларускі грамадска-палітычны дзеяч, старшыня Рады БНР з 1928 па 1943 г.

15 сакавіка

1917 — у Пецярбургу была прынята дэкларацыя беларусаў.

1992 — памёр Уладзімір Цвірка, дзеяч беларускай эміграцыі (Нямеччына, Ангельшчына, Бельгія), журналіст.

1994 — была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

16 сакавіка

1919 (па 28 сакавіка) — у Гародні выдавалася газета „Бацькаўшчына".

З нагоды дня нараджэння
Георгію Валкавыцкаму
(першаму галоўнаму рэдактару нашага тыднёвіка)
жадаем моцнага здароўя,
добрага настрою,
радасці ды натхнення!

«Ніва»

Абвесткі

Чэмпіянат асілкаў

Асяродак спорту і адпачынку (АСіА) ды Гайнаўскі дом культуры арганізуюць 13 сакавіка 2004 г. чэмпіянат для мясцовых здаравякаў па падыманні штангі. Удзельнічаць у ім могуць толькі дарослыя. Заявы прымае бюро АСіА па вуліцы Антона Дзевятоўскага. Заахвочваем да спаборніцтва ўсіх асілкаў. У перапынках мерапрыемства выступяць мастацкія калектывы ГДК. **(яц)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Уладзімір Сасна (Пашкоўшчына)

„Ніва"

Як прыгожа выглядаеш,
Чорныя валасы мела і маеш.
Не родных бацькоў ты мела
І сябе так не глядзела.

Табе грошай не хапала,
Фарбаў сабе не купляла.
Бровы чорныя насіла,
Што натура падарыла.

Ты панчох не закладала,
Басанож па Беласточчыне ступала.
Бацькі Твае паўміралі,
А пра Цябе і не задбалі.

Ты не родны сёстры маеш,
Але ім не дакучаеш.
Яны прыгожа выглядаюць,
Лісткі і каляровыя вокладкі маюць.

Сюды айчымы прыязджалі,
Ад беларусаў галасы дасталі,
За тое нічога не зрабілі,
„Ніве" колеру не падарылі.

„Ніва" аднаго сябра мае,
„Віктар Швед" яго называе.
Ён многа памагаў,
Браў „Ніву" ў рукі і чытаў.

Будзь Ты доўга шчэ жывая,
Хоць Ты — дзеўка пажылая,
Я Цябе яшчэ кахаю,
Хоць па капе далёка маю.

Буду я Табе пісаць,
Каб як жывуць па вёсках расказаць,
Хлеб пякуць, ці дзежы маюць,
Ці арлянскі ўжо купляюць.

• • • • • •

Дзякуем за памяць —
4 сакавіка „Ніве"
споўнілася роўна 48 гадоў.

... А дыхаць, пакуль — можна. І слава! **Фота МІРЫ ЛУКШЫ**

Музычныя навіны

Ужо вядома хто будзе прадстаўляць беларусаў у час фестывалю Еўрабачання. Дуэт Аляксандра і Канстанцін, створаны ў 1998 годзе ў Барысаве. Напэўна фізічныя якасці дуэта вельмі моцна дапоўняць гукаэфекты. Аляксандра — прыгожая „круглая" бландзінка, якая ўяўляе тыповую беларускую прыгажосць і Канстанцін — моцны, вялікі, доўгавалосы музык-гітарыст, насамрэч будуць вельмі „канкрэтна" і „моцна" ўздзейнічаць на еўрапейскіх гледачоў. Можна закахацца! Аляксандра Кірсанава (24 гады) любіць Шанаю Тлайн, студэнтка. Канстанцін Драпеза (32 гады) любіць музыку, падарожжы, і Александрыну. У Еўрабачанні заспяваюць англійскую песню „My Galileo".

Гурт „Н.Р.М." аб'явіў, што ёсць патрэба ў стварэнні другой часткі альбома „Віза Н.Р.М.", дзе беларускія гурты прадстаўляюць свае варыянты гітоў гурту „Н.Р.М.". Паводле сайта „Н.Р.М.", з'явіўся ўжо альбом „Справаздача 1994-2004". Тут самыя вялікія гіты „Н.Р.М." з дзесяцігадовага перыяду існавання. Альбом дапаўняюць дзве новыя кампазіцыі.

Аляксандр Памідораў прыдбаў нашчадка. Дачка Сафія нарадзілася 13 студзеня 2004 г. Віншуем. Пакуль што, новага альбома, які прыйдзецца нам „некалі" прыдбаць, трэба будзе пачакаць. Вядома, што Алесь неўзабаве пачне працу ў студыі гуказапісу. Як кажа, „кавалкаў многа — да таго нецэнзурнага кшталту". Будзем тады чырванець на канцэртах ад сораму.

Гурт „Неўра Дзюбель" у чарговы раз змагаецца з персанальнымі праблемамі, але да гэтага мы ўжо прывыклі. З гурту выкінулі гітарыста Алега Громава, а клавішнік Макс Івашын парваў супрацоўніцтва, каб у спакоі папрацаваць над сваёй сольнай праграмай. З гуртом развіталіся таксама басіст Стась Паплаўскі. Лідэр гурту Аляксандр Кулінковіч знайшоў ужо новых музыкаў. Праблемай стаў усё ж такі наступнік клавішмена. Зараз у гурце клавішы адсутнічаюць. Мо нехта з нашых „зорак" мае шанцы? Спрабуйце!

14 лютага 2004 года гурту „Rima" споўнілася 3 гады. Ужо вядома, што гатовы новы альбом. Мабыць, даступны будзе яшчэ навесну. Дэма-запісы, якія можна атрымаць у час канцэрта гурту, паказваюць, што варта будзе набыць CD. Гэта ж нашы гарадоцкія хлопцы.

Зорка Тэзаўрус. Адны з нямногіх прадстаўнікоў напрамку „хрысціянскага рока" ў Беларусі. Раней выступалі пад назовам „Армагедона". Гэта яны як першыя ў час фестывалю „Басовішча" ў 2002 годзе, заявілі ўсяму свету, што „Жыве Беларусь, калі жыве Хрыстос". Недзе месяцы два назад з'явілася інфармацыя пра альбом „Аднова Тэзаўруса", у якім 17 песень. Тэзаўрус — скарб, які ўключае веру, мову, гісторыю і культуру, гэта сапраўдны скарб, шкада што незаўважаны шырэйшай беларускамоўнай публікай. Музычная стылістыка гурту гэта меладычны гард-кор з дадатковымі клавішнымі інструментамі ды вельмі характэрнай скрыпкай. Асабіста лічу гэты гурт адным з больш надзейных у Беларусі. Ацэнка — 8,5/10.

Падрыхтаваў Татка Стэп

„Н.Р.М.", „Rima", „Zero-85" у «Фабрыцы»

*Рок-гурты **„Н.Р.М."** з Мінска, **„Rima"** (Гарадок), **„Zero-85"** (Беласток) і **„Drapped Fel"** (Беласток) **20 сакавіка г.г.** выступяць з канцэртамі ў пабе „Фабрыка" (ваколіца вул. Юравецкай) **у Беластоку. Пачатак у 19⁰⁰.***

14.03 – 20.03

Баран (21.03. — 19.04.) 19 — 22 сакавіка, у час маладзіка Месяца зможаш рашаць вельмі адважныя задачы. Пазбягай канфліктаў з атачэннем 14 — 16 сакавіка па прычыне квадратуры прабываючага ў тваім знаку Меркурыя да Сатурна — у гэтых днях нічога не вырашыш. Ажыўленне кампанейскіх кантактаў.

Бык (20.04. — 20.05.) 19 сакавіка, калі Венера ўтворыць квадратуру з Нептунам, не дайся звесціся мане і ўяве — у гэты дзень нічога не рашай. Варта стрымаць сваю злосць і ўпартасць. Планеты дыктуюць табе паскарэнне тэмпу жыцця.

Блізняты (21.05. — 21.06.) 20 сакавіка будзеш пад уплывам секстыля Меркурыя да Юпітэра, які абдорыць цябе асаблівай уражлівасцю і інтуіцыяй. З 14 да 17 сакавіка не выбірайся ў падарожжа, бо цяжка будзе табе дабрацца на час; у гэты час не рашай нічога ў важных інтарэсах. Рамантычная фаза ў сувязях.

Рак (22.06. — 22.07.) Варта пазмагацца з выклікамі лёсу — незалежна ад цяжкасцей, можа чакаць цябе вялікі поспех. 15 сакавіка твой планетарны патрон Месяц будзе ў кан'юнкцыі з Юно — маеш шанц узмоцніць свае пачуццёвыя сувязі.

Леў (23.07. — 22.08.) Адкрыюцца перад табою новыя шанцы і магчымасці. Акалічнасці прымусяць цябе да грунтоўных змен і рашэнняў. Можаш пачаць рашаць новыя праекты (паможа табе секстыль Сонца з Марсам 16 — 20 сакавіка). Ільвы з 4 — 9 жніўня — можаце расчаравацца (дробныя справы!) у сваіх сувязях.

Дзева (23.08. — 22.09.) Дзевы з 24 — 30 жніўня пад дэстабілізуючым уплывам Урана: могуць раптам закахацца, можа ім раптам „вярнуцца зрок" і наступіць драматычнае расстанне. Дзевы з 13 — 17 верасня могуць спадзявацца прыкрых вестак. Дзевы з 4 — 11 верасня мусяць быць асцярожнымі на працы (уплыў Чорнага Месяца Ліліт). Новыя фінансавыя перспектывы з 17 сакавіка.

Шалі (23.09. — 23.10.) 16 — 18 сакавіка новыя магчымасці адкрывае перад табою трыгон Юпітэра да Венеры — знакаміты час знайсці новыя крыніцы прыбытку. 18 — 21 сакавіка шырокай дугой абмінай людзей, якія абяцаюць табе залатыя горы (квадратура Нептуна да Венеры), лёгка цябе ашукаць. НЕ ПАДПІСВАЙ У ТОЙ ЧАС НІЯКІХ ВАЖНЫХ ДАМОЎ. 17 — 21 сакавіка не выдавай вялікіх грошай, не паджыроўвай нічога ў банку.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Марс падпаліць вялікія жарсці. Месяц падкажа табе людзей, якія табе сапраўды спрыяюць. Да 20 сакавіка шмат нагод добра пазабаўляцца, час на рамантычныя сустрэчы ды любоўныя парывы.

Стралец (22.11. — 21.12.) 15 — 19 сакавіка Венера ў трыгоне да Юпітэра будзе спрыяць у наладжванні новых кантактаў, падтрымае ўсялякія фінансавыя рухі. Секстыль Юпітэра да планетоіда Цэрэс 14 сакавіка паможа табе ў паправе сямейных адносін.

Казярог (22.12. — 20.01.) Транспартныя праблемы могуць дапасці да цябе ў час працягвання квадратуры Меркурыя з Сатурнам 14 — 16 сакавіка — не плануй падарожжа, не праводзь важных размоў. Каля 17 сакавіка будзеш мець ахвоту апекавацца партнёрам, агарнуць яго любоўю і чуласцю.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Ахвота падарожнічаць, ісці ў госці. Абавязкова купі купон „Таталётка" ці латарэйны!!!

Рыбы (20.02. — 20.03.) 14 сакавіка кан'юнкцыя Нептуна з планетоідам Вестай узмоцніць тваю інтуіцыю і прарочыя здольнасці; запамятай сны — у іх можа быць шмат падказак. Каля 20.03. знакамітыя ідэі і адкрывальніцкія развязкі дакучлівых праблем. 19.03. не давярай падазроным людзям. Не трап у пастку! Калі ў штосьці хочаш інвеставаць, рабі гэта вельмі асцярожна!

Агата Арлянская

Адгаданка

1. рака, якая з'яўляецца ўсходняй мяжой Беластоцкага павета, 2. важны чыгуначны вузел у Гайнаўскім павеце, 3. павятовы цэнтр для Сідры і Крынак, 4. рэчка і гмінная мясцовасць на паўночным усходзе Гайнаўскага павета, 5. гміна ў Беластоцкім павеце з Войшкамі і Дарожкамі, 6. надбужанская гміна ў Сямятыцкім павеце, 7. гмінная мясцовасць на ўсходзе Беластоцкага павета побач якой адбываецца „Басовішча". **(ш)**



Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлых клетках, чытаемых зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 5 нумара

Аул, бой, вежа, гміна, гуж, джын, Ельцын, зяць, меч, мыш, мяч, прытча, Сож, цень, цыган, чай, Чылі, Эдэм, ягня.

Рашэнне: **Прыгажосць важнейшая жанчыне чым інтэлігенцыя, бо мужчынам лягчэй глядзець чым думаць**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Раманчуку** з Гайнаўкі.

ISSN 0546-1960